Кожны выпісаны экземпляр “Настаўніцкай газеты” — гэта яшчэ адзін голас за стварэнне ў Беларусі нацыянальнай сістэмы адукацыі, за сацыяльную абароненасць педагогаў

ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года | №48 (4406) СУБОТА, 4 чэрвеня 1994 года | Кошт па падпісцы — 20 руб., у розніцу — 100 руб.

НГ-ІНФАРМ

ПАВЕДАМЛЯЕ ПРЭС-ЦЭНТР МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ

Аб парадку ўсынаўлення

Міністэрствам адукацыі распрацаваны нарматыўныя акты “Аб парадку ўсынаўлення дзяцей-грамадзян Рэспублікі Беларусь і ўстанаўлення апекі (папячыцельства) над імі замежнымі грамадзянамі” і “Аб органах аховы дзяцінства ў Рэспубліцы Беларусь”, якія зараз узгадняюцца з зацікаўленымі міністэрствамі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ

З 31 мая ў аздараўленчым летніку Зубраня адкрылася змена для лаўрэатаў Рэспубліканскага мастацкага фестывалю выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў і спецыяльных школ “Вясёлкавы карагод”. Пераможцы фестывалю будуць не толькі адпачываць у маляўнічым месцы нашай Рэспублікі, але і выступяць са справаздачнымі канцэртамі, прымуць удзел у выніковым гала-канцэрце.

* * *

2—3 чэрвеня ў Полацкім дзяржаўным універсітэце адбылася Рэспубліканская канферэнцыя “Метады рэгулявання фінансавых узаемаадносін ва ўмовах пераходу да рынку”.

* * *

З 6 па 25 чэрвеня на факультэце кіруючых работнікаў і спецыялістаў вышэйшай школы ІПК кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі працуюць курсы для прарэктараў па выхаваўчай рабоце, дзе будуць абмяркоўвацца праблемы сацыяльнага парадку, а менавіта: арганізацыя выхаваўчай работы студэнцкай моладзі ў сучасных умовах, асаблівасці, формы, метады і сродкі яе правядзення, вырашэнне вострых сацыяльна-эканамічных праблем студэнтаў, студэнцкіх сямей, уладкаванне іх паўсядзённага жыцця і быту. Арганізуецца панарама абмену вопытам, праводзяцца справавыя і арганізацыйна-дзейнасныя гульні, мэтавыя абмеркаванні.

* * *

9—10 чэрвеня ў Нацыянальным інстытуце гуманітарных навук выкладчыкі гісторыі ПТВ і ССНУ збяруцца на семінар-нараду па надзённых праблемах гістарычнай адукацыі. Удзельнікі абмяркуюць пытанні пераходу на новы змест гістарычнай адукацыі ў прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных установах Рэспублікі Беларусь.

* * *

14 чэрвеня ў Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі адбудзецца семінар-нарада намеснікаў начальнікаў упраўленняў адукацыі аблгарвыканкамаў і загадчыкаў метадычных кабінетаў прафтэхадукацыі па праблемах метадычнага забеспячэння прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў.

14—15 чэрвеня на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта адбудзецца Рэспубліканская канферэнцыя “Камп’ютэрныя праграмы ў выкладанні беларускай і замежных моў”.

* * *

15—16 чэрвеня на базе шэрагу прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і спецыяльных школ-інтэрнатаў Мінска пройдзе рэспубліканскі семінар дырэктараў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў па пытаннях прафесійнай адукацыі дзяцей-інвалідаў і дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця.

* * *

На аўтарскіх курсах прафесара Л.А.Мурынай, што праводзяцца на факультэце кіруючых работнікаў і спецыялістаў школ ІПКіПКРСА з 20 чэрвеня па 2 ліпеня, пойдзе зацікаўленая размова аб змесце выкладання курса “Рыторыкі” ў 10—11 класах.

Мэта курсаў — дапамагчы настаўнікам авалодаць майстэрствам выкладання рыторыкі як навукі; удасканаленне методыкі. Слухачы атрымаюць дыдактычны матэрыял па прадмеце.

* * *

21—22 чэрвеня ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным інстытуце пройдзе Рэспубліканская канферэнцыя “Беларуская пачатковая школа: праблемы і перспектывы развіцця”.

28 чэрвеня — 2 ліпеня на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта пройдзе Міжнародная канферэнцыя “Прымяненне лазераў у навуках аб жыцці”.

Віктар ІЎЧАНКАЎ,
вядучы эксперт упраўлення аналітычнай работы і перспектыўнага развіцця.



ДЗЯКУЙ ГРАФУ. І НЕ ТОЛЬКІ ЯМУ

Пабудаваў граф Старшынскі ў краі блакітных азёраў у пасёлку Камарова Мядзельскага раёна сабе дом. Загадаў стаўні выкапаць ды парк разбіць. Вось толькі, кажуць, не частым госцем быў тут — справы дзяржаўныя ўсё больш у Варшаве жыць вымушалі.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

КОНКУРСЫ

Аўтар лепшага буквара — Анатоль Клышка

Зацверджаны вынікі конкурсу па стварэнні беларускага нацыянальнага буквара.

Згодна з пастановай калегій Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь “Аб правядзенні конкурсу па стварэнні беларускага нацыянальнага буквара” ад 31 снежня 1991г. №54/8 быў аб’яўлены адкрыты конкурс па стварэнні новага буквара.

У адпаведнасці з умовамі конкурсу паступілі 4 рукапісы:

Буквар №1 пад дэвізам “Люди перестают мыслить, когда перестают читать”;

Буквар №2 пад дэвізам “Все начинается с детства”;

Буквар №3 пад дэвізам “Школа радасці”;

Буквар №4 пад дэвізам “Раніца”.

Журы падвяло вынікі конкурсу і прызнала пераможцамі рукапісы пад дэвізамі:

Буквар “Раніца” аўтара А.К.Клышкі — першая прэмія.

Буквар “Школа радасці” аўтара Е.Г.Шылец — другая прэмія.

Першая прэмія ў памеры 600000 рублёў прысуджана Анатолю Клышку, другая — у памеры 450000 рублёў — Еўдакіі Шылец.

Навукова-метадычнаму цэнтру навучальнай кнігі і сродкаў навучання, выдавецтву “Народная асвета” даручана падрыхтаваць рукапіс пад дэвізам “Раніца” А.К.Клышкі ў якасці буквара да 1996-97 навучальнага года.

Рукапіс пад дэвізам “Школа радасці” Е.Г.Шылец вырашана мэтазгодным выдаць у якасці паралельнага падручніка да 1996-97 навучальнага года.

НАРАДЫ

НЕ БУДЗЕМ МЫ СТАЯЦЬ НА РАЗДАРОЖЖЫ?

ШКОЛА ЧАКАЕ НОВЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ І РАСПРАЦОВАК ПА ПРАБЛЕМАХ ВЫХАВАННЯ

Жыццё, як сказаў адзін мудрэц, самая лепшая кніга. Аднак сёння яно падкінула нам безліч праблем, перад якімі мы, дарослыя, разгубіліся. Катастрафічна расце дзіцячая злачыннасць. У партрэце сучаснага школьніка на першым плане такія рысы, як эгаізм, сквапнасць, жорсткасць і грубасць. Сёння, мабыць, як нікому іншаму, цяжэй за ўсіх настаўніку. Жыццё актыўна процідзейнічае супраць яго прафесіяналізму, шчырых намераў, намаганняў. Што сёння можа ўзяць з яго настаўнік за рацыянальнае, карыснае? Ці ёсць такая кніга, якая б магла б стаць настольнай для настаўніка — выхавацеля ў сённяшніх умовах працы?

Размова пра гэта наспела даўно, сцвярджалі ўсе ўдзельнікі нарады, якая адбылася днямі ў Навукова-метадычным Цэнтры навучальнай кнігі і сродкаў навучання. Тэма размовы была вызначана так: “Павышэнне эфектыўнасці навукова-метадычных распрацовак па праблемах выхавання і іх выкарыстанне ў рабоце навучальна-выхаваўчых устаноў”. У нарадзе прымалі ўдзел загадчыкі кафедраў педагогікі, псіхалогіі, сацыяльнага выхавання, педагогікі і методыкі пачатковага навучання, тэорыі і методыкі выхавання дзесяці вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі, а таксама інстытутаў удасканалення настаўнікаў.

— Змены ў грамадска-палітычным жыцці патрабуюць новых прыярытэтаў у змесце выхавання, у адносінах да асобы, калектыву, сям’і, — сказаў ва уступным слове намеснік міністра адукацыі Георгій Бутрым. — Да вырашэння праблем метадычнага забеспячэння сістэмы выхавання ва ўмовах нацыянальнага адраджэння, суверэнітэту, рынкавых зносін патрэбна прыцягнуць вучоных, метадыстаў і арганізатараў. Сваё важкае слова тут павінна сказаць навука, патрэбны аналіз і даследаванне перадавой практыкі. Менавіта дзеля гэтага мы і сабраліся.

Што мы маем сёння ў нашых бібліятэках? Што маюць “на руках” настаўнікі? Ідэалагічна праграмы і канцэпцыі па выхаванні вытрыманы, а падручнікаў — няма. А тыя, што ёсць, сказаў нехта на нарадзе, патрэбна адправіць у архіў. Ці так гэта? Няўжо састарэла і прыйшла ў нябыт уся літаратура, якой вучонымі і практыкамі было напісана нямала?

Што сёння могуць прапанаваць кафедры ВНУ ў якасці навучальна-метадычных дапаможнікаў класнаму кіраўніку школы, тэхнікума або вучылішча? Што параяць практычнаму псіхолагу, сацыяльнаму педагогу? Як у сённяшніх умовах наладзіць і пашырыць выпуск літаратуры і іншых сродкаў навучання навукова-пазнавальнага, развіваючага характару для выкарыстання ў пазакласнай рабоце і ў вольны ад вучобы час?

Лабараторыя выхаваўчай работы Навукова-метадычнага Цэнтра навучальнай кнігі і сродкаў навучання зрабіла аналіз бібліятэчнай літаратуры па напрамках выхаваўчай работы ў навуковых і пазашкольных установах. З вынікамі работы лабараторыі ўдзельнікаў нарады пазнаёміла метадыст Цэнтра Соф’я Русак.

Высвятляецца такі малюнак. Напрыклад, настаўнік пачатковых класаў не забяспечаны матэрыяламі для пазакласнай работы. У Рэспубліцы амаль не выдавалася літаратура па гурткавай рабоце ў пазашкольных установах, у прыватнасці, па турызму і краязнаўству, тэхнічнай творчасці, развіцці народных мастацкіх рамёстваў. Зусім не распрацавана педагогіка лета, канікулаў, вольнага часу дзяцей, арганізацыі сямейнага адпачынку.

Цэнтрам робяцца першыя крокі, каб выправіць становішча, якое склалася. У дзяржаўную праграму “Навучальная кніга” да 2000 года ўнесена 118 пазіцый па выданню “выхаваўчай” літаратуры. Амаль палова — 53 пазіцыі — пакуль не забяспечаны аўтарамі. Складзены тыпавы пералік для выхаваўчай работы ў агульнаадукацыйнай школе. З кастрычніка мінулага года паступіла толькі 30 рукапісаў. Восем рукапісаў накіраваны ў выдавецтве, 4 падрыхтаваны да друку, 6 адхілены па розных прычынах. Восем планаў-праспектаў паступіла ад аўтараў па тэматыцы выхаваўчай работы, а гэта — патэнцыяльныя прэтэндэнты на ўключэнне ў дзяржзаказ па выданні у 1996 годзе.

Да новага навучальнага года будуць надрукаваны зацверджаныя Міністэрствам адукацыі 67 праграм, распрацаваныя Нацыянальным інстытутам адукацыі разам з практыкамі.

Зараз лабараторыя вядзе работу на падборы рэдакцыйных калегій, аўтараў, аўтарскіх калектываў ці, як было вобразна сказана, ідзе пошук сваіх “зорак” тэорыі і практыкі выхавання. Але ж іх трэба не толькі знайсці, але і вырасціць. Словам, наперадзе вялікая і карпатлівая работа.

Мяркуючы па актыўнасці ўдзельнікаў нарады, справа павінна зрушыцца з месца. Ужо сёння многім з іх ёсць і было што прапанаваць у сэнсе актуальнасці, многаварыянтнасці, выкарыстання тэхнічнай аснашчанасці, уліку дасягненняў сусветнай навукі і практыкі па праблемах псіхалогіі выхавання.

Будзем спадзявацца, што ўзнятая на нарадзе праблема не застанецца пустой размовай. А ўсіх, каго яна хвалюе, каму па ёй баліць душа, у тым ліку і ўдзельнікаў нарады, мы просім прыняць удзел у дыскусіі, якую мяркуем распачаць на старонках нашай газеты. Лічу, што яна дапаможа настаўніку, які сёння на раздарожжы.

У нарадзе прынялі ўдзел дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Уладзімір Валадзько, дырэктар Навукова-метадычнага Цэнтра навучальнай кнігі і сродкаў выхавання Максім Круглей, загадчык кафедры сацыяльных праблем выхавання Інстытута павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі Уладзімір Кабуш.

Святлана БЕНЬ.

НГ-ІНФАРМ

Тэлеграма ў нумар

Рэспубліканскі экалагічны цэнтр навучэнцаў віншуе ўсіх настаўнікаў школ і педагогаў пазашкольных устаноў з днём аховы навакольнага асяроддзя!

1995 год аб’яўлены Саветам Еўропы “Еўрапейскім годам аховы прыроды”. Давайце аб’яднаем нашы намаганні ў дасягненні гармоніі паміж чалавекам і прыродай, навучым нашых дзяцей беражліва і паважліва адносіцца да ўсяго жывога, што іх акружае.

Жадаем усім, хто будзе займацца гэтай пачэснай справай, поспехаў і здароўя, аптымізму і веры ў тое, што мы робім.

Кожны з нас павінен прыняць усю паўнату адказнасці за захаванне жыцця на Зямлі.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ЭКАЛАГІЧНЫ ЦЭНТР

ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ

СВЯТА СВЯТОЙ ЕФРАСІННІ

Сёння ў Полацку пачынаюцца ўрачыстасці, прысвечаныя памяці славутай заступніцы Беларусі, знакамітай асветніцы і рэфарматарцы нацыянальнай культуры і мовы святой Ефрасінні Полацкай.

На пазачарговай канферэнцыі Усебеларускага жаночага фонду Ефрасінні Полацкай, прэзідэнтам якой з’яўляецца беларуская пісьменніца Валянціна Коўтун, прынята рашэнне ўтварыць Міжнародную Прэмію Святой Ефрасінні. Як растлумачыла Валянціна Міхайлаўна, гэтай прэміяй будуць узнагароджвацца асобныя дзеячы і грамадскія арганізацыі за асабліва значныя поспехі ў галіне развіцця культуры, навукі, духоўнай асветы і маладзёжнага руху, цесна звязаныя з духоўным адраджэннем беларускага народа.

Знакамітыя пісьменнікі, мастакі, кампазітары і навукоўцы, святары Беларусі, а таксама вядомыя асобы далёкага і блізкага замежжа ўваходзяць у склад Камітэта і кансультацыйнай Камісіі па прысуджэнні прэміі.

Заўтра у Агульнанародны дзень Святой Ефрасінні такія прэміі будуць уручаны тым, хто сваёй працай садзейнічае развіццю нацыянальнай літаратуры, культуры, навукі, хрысціянскіх традыцый.

Пройдзе святочная літургія з удзелам мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, патрыяршага экзарха усяе Беларусі Філарэта. Адбудзецца дабрачынны святочны канцэрт Ефрасінні Полацкай з удзелам лепшых мастацкіх калектываў краіны і камернага хору з Германіі.

На свята ў Полацк прыехалі знакамітыя людзі Беларусі, далёкага і блізкага замежжа дзеля ўсенароднага яднання святлом святой Ефрасінні.

Святлана ХОРСУН.

ПРАПАНУЕМ ШКОЛЬНЫЯ ПАРТЫ
па танных цэнах
Тэлефануйце ў Мінск: (0172) 76-84-02; 76-83-61

Ф. СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 63867 (індэкс выдання)
«Настаўніцкая газета» Колькасць камплектаў
на 199 год па месяцах
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Куды (паштовы індэкс) (адрас)
Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА
ПВ | месца | літар
на газету 63867 (індэкс выдання)
«Настаўніцкая газета»
Кошт: падпіскі ___руб.___кап.; перавадрасоўкі ___руб.___кап.
Колькасць камплектаў
на 199 год па месяцах
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Куды (паштовы індэкс) (адрас)
Каму (прозвішча, ініцыялы)

НГ-ІНФАРМ

ДА 50-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

ГІРЛЯНДА ПАМЯЦІ

Ва ўсіх навучальных групах Вілейскага ПТВ-200 прайшлі адкрытыя выхаваўчыя гадзіны "Зямля пад белымі крыламі", якія прысвечаны 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пад знакам слаўнай гадавіны тут праводзіцца і шмат іншых мерапрыемстваў. Некалькі раней у выхаваўчы час тут адбыліся гутаркі пад назвай "Гэтых дзён не змоўкне слава", прайшлі вечары адпачынку, агляд мастацкай самадзейнасці. Фальклорная група рэгулярна выязджае ў школы раёна. Навучэнцы ўсклалі гірлянду памяці з жывых кветак да помніка ахвярам фашызму, што знаходзіцца ў вёсцы Порса. У 1943 годзе тут пахавана 150 вязняў Вілейскай турмы, спаленых зажыва.

У першай палове чэрвеня на Вішнеўскім возеры вучылішча правядзе трохдзённы турысцкі злёт, галоўным лейтматывам якога таксама будзе ўшанаванне герояў мінулай вайны.

Наш кар.

АЎТАРСКІЯ КУРСЫ

Да дасканаласці майстэрства

Гродзенскім абласным інстытутам удасканалення настаўнікаў упершыню былі арганізаваны аўтарскія курсы намеснікаў дырэктараў ПТВ па навучальнай рабоце.

Курсы праводзіліся на базе ПТВ-127 Гродна. Шмат карыснага для сваёй работы мы ўзялі ў час гэтых курсаў. Кожны дзень вучобы быў не толькі інфармацыйна насычаны, змястоўны, але і цікавы па форме падачы: сустрэча з дырэктарам вучылішча А.П.Зарэцкім, знаёмства з базай вучылішча, навучальнымі кабінетамі, лекцыі, выставы раздатачнага і дыдактычнага матэрыялаў, адкрытыя ўрокі і іх аналіз, выступленні вопытных выкладчыкаў. А яшчэ мы пабывалі ў ПТВ-49, 119.

Марыя Уладзіміраўна Данілковіч, намеснік дырэктара па навучальнай рабоце ПТВ-127, працуе ў вучылішчы з дня яго заснавання. Творчы, умелы кіраўнік, з багатым жыццёвым і прафесійным вопытам, яна зыходзіць у сваёй практычнай дзейнасці з таго, што паспяховае дасягненне асноўных мэт навучання і выхавання вучняў магчыма толькі пры дакладнай арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу.

У вучылішчы адпрацавана дакладная сістэма планавання, за аснову якой бярэцца паглыбленая праца па адзінай агульнавучылішчнай праблеме. Глыбока прадумана, ахопліваючы ўсе бакі навучальна-выхаваўчага працэсу, плануе М.У.Данілковіч сваю работу. План складаецца на год, на месяц і на кожны дзень. Асабліва канкрэтна распрацоўваюцца раздзелы, якія прадугледжваюць кантроль за якасцю ведаў вучняў па кожным прадмеце і індывідуальную работу з выкладчыкамі па павышэнні іх педагагічнага майстэрства.

Марыя Уладзіміраўна ўмела дапамагае калегам пакарыць сваю педагагічную вышыню. Адным — зрабіць першыя крокі ў педагогіцы, зразумець раней невядомае, набыць упэўненасць у сваіх сілах. Другім — падняцца да дасканаласці прафмайстэрства. Нам давялося ўбачыць, як выкладчыкі паказвалі паўрочныя планы яшчэ не праведзеных урокаў, паведамлялі тэмы і мэты, дзяліліся сваімі меркаваннямі аб метадах вядзення ўрока, выбары сродкаў навучання.

Мы пабывалі на адкрытых уроках фізікі, матэматыкі, рускай літаратуры, фізкультуры. Для ўсіх урокаў характэрна павага да навучэнцаў, уважлівае стаўленне да іх думкі. Выкладчыкі сапраўды вучаць навучэнцаў вучыцца. Яны не проста даюць ім суму ведаў, а вучаць думаць, самастойна здабываць інфармацыю, рабіць лагічныя вывады.

Пры аналізе ўрокаў мы ўбачылі, што Марыя Уладзіміраўна ўдзяляе вялікую ўвагу аналізу наведаных урокаў: рыхтуючыся да субяседавання з выкладчыкам, яна правярае журналы тэарэтычнага навучання, праглядвае сшыткі навучэнцаў, перспектыўна-тэматычнае планаванне. Пры аналізе ўрока звяртае асаблівую ўвагу на яго прафесійную і выхаваўчую накіраванасць. Марыя Уладзіміраўна вучыць выкладчыкаў аналізаваць свае ўрокі. Сістэматычна праводзіць інструктыўна-метадычныя нарады, на якіх вырашаюцца аператыўныя пытанні навучальна-выхаваўчага працэсу.

У выніку дакладна арганізаванай работы дырэктара па навучальнай рабоце ў ПТВ-127 склаўся творчы калектыў выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання.

...Курсы нашы заканчваліся, а ў вучылішчы пачынаўся тыдзень педагагічнага майстэрства.

Пры падвядзенні вынікаў нашай работы ўсе былі аднадушныя: трэба планаваць і ў далейшым праводзіць аўтарскія курсы.

А.САЛЕЙ,
намеснік дырэктара па навучальнай рабоце Скідзельскага ПТВ-199.

ДЗЯКУЙ ГРАФУ. І НЕ ТОЛЬКІ ЯМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Але вось неяк летам 1940 года прыйшлі сюды незнаёмыя людзі і, паводле загада Міністэрства земляробства, адкрылі ў сядзібе школу трактарыстаў, вядомую зараз як старэйшае ў рэспубліцы Свірскае ПТВ №207 механізацыі сельскай гаспадаркі.

Многа вады ўцякло з таго часу. Абмялелі сажалкі, многае змянілася на іх берагах. Побач з домам графа вырас новы корпус вучылішча, паявіліся майстэрні, машынны двор, ферма, падсобныя памяшканні. У апошнія гады з'явіўся пасёлак з добраўпарадкаваных катэджаў, у якіх цяпер жывуць многія сем'і работнікаў вучылішча. А сёння гэта 21 выкладчык і 26 майстроў вытворчага навучання. Многія з іх — былыя выпускнікі вучылішча. Яны вучаць пасланцоў Мядзельскага, Астравецкага і Смаргонскага раёнаў такім прафесіям, як трактарыст-машыніст, вадзіцель аўтамашын, аўтаслесар, электраманцёр. Дзяўчаты з энтузіязмам асвойваюць спецыяльнасць закройшчыцы-швачкі, якая заўсёды карыстаецца павагай і попытам у вёсцы.

Штогод 150 — 160 чалавек пакідаюць сцены вучылішча, уступаюць у самастойнае жыццё, авалодаўшы тут неабходнымі прафесійнымі навыкамі.

Палі трох суседніх раёнаў у асноўным апрацоўваюць былыя "фабзайцы" з 207-га вучылішча. Дзяўчаты працуюць у КБА, падсобных цэхах калгасаў. Многія ўладкоўваюцца на працу ў Маладзечна. І ўсіх іх праводзіць у новае, невядомае жыццё стары графскі дом, які стаў цяпер родным і для іх.

Аднак няўмольны час творыць сваю работу, і дом паступова губляе былую прыгажосць. Вось і вырашыла кіраўніцтва вучылішча рэстаўрыраваць гмах, вярнуць яму ранейшы выгляд. Праект падрыхтаваны ўжо. Але ці знойдуцца сродкі дзеля ажыццяўлення гэтай добрай справы?

Юрый БОНДАРАЎ,
фота аўтара.

АДГУКНІЦЕСЯ!

Па голасу сэрца

Прайшло 40 гадоў, як мы закончылі вельмі аўтарытэтную ў той час навучальную ўстанову — Мазырскае педвучылішча. Радзіма нам уручыла пуцёўкі ў жыццё, даверыла вялікую справу выхавання і навучання будучых грамадзян. Мы раз'ехаліся ва ўсе куткі Бацькаўшчыны, каб выканаць свой грамадзянскі і прафесійны абавязак: сеяць разумнае, добрае, вечнае.

І вось мы ўжо сталі дзядулямі і бабулямі, але многія і сёння яшчэ плённа працуюць. Мы далі пуцёўкі ў жыццё дзесяткам тысяч сваіх выпускнікоў. Вельмі добра будзе, калі мы сустрэнемся праз 40 гадоў. Нам жа ёсць пра што расказаць.

Я прапаную, паважаныя мае аднакурснікі, стварыць арганізацыйны камітэт, які б больш паспяхова займаўся пытаннямі арганізацыі такой сустрэчы.

З павагаю да Вас настаўнік роднай мовы і літаратуры ЛЯГУН Павел Давыдавіч. Мой адрас: 247600, г. Хойнікі, вул. Катоўскага, 90, тэл. 2-27-16.

З НАГОДЫ

Экалагічны профіль

Заўтра адзначаецца Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя. Пасля аварыі на ЧАЭС гэта праблема набыла для Беларусі асаблівую вастрыню. Ці адчуюць яе сённяшнія школьнікі? Што трэба зрабіць для гэтага? Давайце паслухаем Уладзіміра Разумовіча, дырэктара Баранавіцкай экалагічнай гімназіі.

Вось некаторыя асноўныя прынцыпы экалагічнай адукацыі і выхавання, якія нам бачацца.

Даступнасць. Мы разглядаем яе ў двух аспектах: па-першае, як магчымасць любому школьніку атрымаць асновы экалагічных ведаў, паколькі гімназія не з'яўляецца элітарнай навучальнай установай; падругое, ступень складанасці прапануемых на ўроках і ў пазаўрочнай дзейнасці матэрыялаў адэкватна ўзроўню інтэлектуальнага развіцця школьнікаў усіх узроставых груп.

Бесперапыннасць. Экалагічны матэрыял вывучаецца на працягу ўсіх гадоў навучання ў гімназіі. Пры гэтым захоўваюцца пераемнасць і паслядоўнасць вывучаемых тэм у адпаведнасці з ростам ступені цяжкасці і складанасці прапаноўваемых асноў навук.

Узаемазалежнасць. У навучальных праграмах усіх ступеняў адукацыі ўзмоцнена роля прадметаў, якія тычацца навакольнага асяроддзя і яго аховы. Ключавымі дысцыплінамі ў гэтай галіне з'яўляюцца біялогія, геаграфія, хімія і фізіка, а ўсе іншыя прадметы садзейнічаюць паглыбленню вывучэння экалогіі і праблем аховы навакольнага асяроддзя.

Практычная накіраванасць (прынцып карыснасці). Тэарэтычныя веды, набытыя ў сценах гімназіі, маюць прыкладнае значэнне не толькі ў прафесійнай дзейнасці чалавека, але садзейнічаюць таксама і яго выжыванню ў любых бытавых і экстрэмальных умовах.

Мы вялі падрыхтоўку ўсіх удзельнікаў навучальна-выхаваўчага працэсу (настаўнікаў, вучняў, бацькоў) да працы ў новых умовах з тым, каб захаваць спрыяльны псіхалагічны клімат у калектыве аднадумцаў. Асаблівую ўвагу звярнулі на падрыхтоўку калектыву да стварэння гімназіі, паколькі такое рашэнне не магло быць прынята ў дырэктарскім кабінеце, ды і прывяло б яно да канфліктаў: з групай настаўнікаў, якія па розных прычынах могуць аказацца непадрыхтаванымі да работы ў гімназіі; з вучнямі і іх бацькамі, якія будуць незадаволены магчымымі дадатковымі нагрузкамі і выбраным профілем навучання.

Арганізавалі апераджальнае навучанне кіраўнікоў школы, настаўнікаў, якія вядуць прадметы экалагічнага цыкла, і настаўнікаў пачатковых класаў. Перагледзелі арганізацыйныя структуры кіравання, іх функцыі і механізмы. У штатным раскладзе з'явіліся новыя пасады, характэрныя для экалагічнай накіраванасці гімназіі: намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце (галоўны эколаг) і загадчык станцыі кліматычнага маніторынга (метэастанцыі).

Створаны творчыя мікрагрупы для распрацоўкі новых навучальных планаў і праграм па экалагічным навучанні і выхаванні. Вызначаны кампаненты экалагічнай культуры і ўзроўні экалагічнай свядомасці навучэнцаў.

Складаемыя экакультуры ўключаюць у сябе: навуковыя экалагічныя веды, навуковае экалагічнае мысленне, матывы экалагічных паводзін, грамадска-экалагічную актыўнасць, самаацэнку і самакантроль экалагічных паводзін у навакольным асяроддзі. Узроўні экалагічнай свядомасці павінны выявіцца ў інфармаванасці, зацікаўленасці, занепакоенасці; перакананасці (матывацыі дзейнасці), дзейнасці (паводзінах у навакольным асяродку).

Неабходна адзначыць, што ўзроўні паказчыкаў экалагічнай выхаванасці вучняў распрацаваны з улікам розных узроставых груп: для 1 — 4, 5 — 7, 8 — 9, 10 — 11 класаў.

Трэба мець на ўвазе, што ў новай якасці мы закончылі толькі першы навучальны год.

ПАДЗЯЛЮСЯ З ВАМІ

КВЗ? НЯМА ПРАБЛЕМ!

Людзі, якія даўно не наведвалі школу, уяўляюць жыццё яе шэрым, сумным, будзённым. Што ж, можа дзе-небудзь яно і сапраўды такое. Але, на шчасце, такая характарыстыка не адносіцца да школ Фрунзенскага раёна сталіцы. Ужо некалькі год запар тут існуе цудоўная традыцыя праводзіць раённыя КВЗ.

Напачатку здавалася, што ажыццявіць такую імпрэзу ў межах цэлага раёна будзе проста немагчыма. І добра, што такая думка не спраўдзілася. А ўсё таму, што за справу ўзяліся людзі, якія ў свой час не памыліліся ў выбары прафесіі. Да таго ж, гэтую ідэю падтрымалі і дырэктары школ, якія перадалі энергію свайго настаўніцкага сэрца дзецям.

Цёплае веснавое сонца не цікавіла нас, бо не хацелася пакідаць гасцінная залы Дома культуры імя Кісялёва, хацелася яшчэ і яшчэ раз сустрэцца з сімпатычнымі, вясёлымі, знаходлівымі камандамі школ, якія падаравалі нам сапраўднае свята.

Прайшло ўжо некалькі дзён. А памяць бударажаць успаміны, хочацца падзяліцца з чытачамі нашай газеты сваімі думкамі і ўражаннямі.

У заключны трэці тур трапілі каманды: "Няма праблем" гімназіі №198, "Ваганты" школы №126, "Абанент 136" школы №136, якія перад гэтым прыклалі столькі намаганняў, што нават кампетэнтная камісія без вялікіх цяжкасцяў з поўнай адказнасцю прызнала за імі права заняць прызавыя месцы.

Перад змаганнем каманды з удзячнасцю прынялі прывітальнае слова і пажаданні каманды-пераможцы мінулага года — школы №136, якая ўступіла месца сваім паслядоўнікам — камандзе гімназіі №198.

Візітная картка гімназіі дакладна адпавядала як назве каманды, так і тым далейшым нумарам, якія яна прадстаўляла. Першапачатковая перамога ды актыўная падтрымка залы акрылілі гімназістаў. З гэтай нагоды было заканамерным і тое, што каманда ўпэўнена ўзяла напрамак на перамогу і ў другім конкурсе. Яна хутка арыентавалася і не толькі задавала сваім сапернікам надзённыя, з ноткамі жартаўлівасці, пытанні, але і давала трапныя адказы.

Цікава было назіраць за ўдзелам і каманды арганізатараў школ у "размінцы". Пэўна ж, гэтыя людзі маюць свой вопыт у падобнай справе, паколькі такіх здольнасцяў ад іх вымагае сама спецыфіка працы.

Было бачна, як цяжка даводзілася і капітанам каманд, бо на іх ускладалася індывідуальная адказнасць за лёс перамогі. Гэтая адказнасць значна большала, калі ім даводзілася паказваць сваю вынаходлівасць і смеласць пошуку без падтрымкі сяброў па камандзе. Менавіта падобную падтрымку, відаць, атрымала капітан каманды "Няма праблем" Тацяна Аляксеева, за якую хварэла добрая палова залы і падтрымлівала яе бадзёрым, актыўным скандіраваннем. Хутчэй за ўсё, гэта атрымалася дзякуючы папярэднім перамогам капітана і яе каманды. Але хоць капітан трымаўся дастойна, усё ж-такі вопыт і жыццёвая практыка капітана каманды "Шкрабы" адыгралі сваю ролю: ён заняў прызавое месца. З павышаным хваляваннем як каманда, так і тыя, хто яе падтрымліваў, чакалі, калі журы аб'явіць агульны вынік за раней прадстаўленыя нумары. Трэба было бачыць шчаслівыя твары і ўсмешкі радасці ад таго, што гімназія лідзіруе і тут, што капітан каманды аказаўся на вышыні становішча і нікога не падвёў.

Але тут стаў зразумелым і той факт, што каманда мінулагодняй школы-пераможцы так проста тую славу, якая замацавалася за ёю, аддаваць не збіраецца. У чарговым конкурсе — рэклама спонсара — прадстаўнікі гэтай навучальнай установы паказалі не рэкламу, а рэкламны ролік. А вось калі на сцэну выйшла каманда "Няма праблем", то ўзнікла ўражанне, што перад табой выступаюць прафесійныя артысты з прафесійнай рэкламай.

Хоць і прайшло даволі часу пасля пачатку такога захапляючага відовішча, але многія здзівіліся, калі вядучыя аб'явілі апошні конкурс — хатняе заданне на тэму "Аб школьніку бедным закіньце слова". "Шкрабы" далі магчымасць пазнаёміцца не толькі са сваім вопытам выхавання школьнікаў, але і паказаць, наколькі яны могуць адстойваць іх інтарэсы. Прадстаўленая ў жартоўнай форме праграма стала своеасаблівай навукай на будучае для многіх.

Калі журы аб'яўляла вынікі, трэба было чуць тыя авацыі прысутных, што з уздымам успрынялі паведамленне пра перамогу каманды "Няма праблем". А якая іскрынка шчасця ў гэты момант засвяцілася ў вачах дырэктара гімназіі Людмілы Станіславаўны Аляксеевай! Вядома ж, гэта яе гімназісты, яе выхаванцы, а таму іх перамога — яе перамога.

Трэба ўспомніць і тых, без чыёй дапамогі свята магло б і не быць. Гэта спонсары: ВКП "Юнацтва", МВА "Гарызонт", сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства "Аптітэк", юрыдычная фірма "Салумэкс", фонд "Мы — дзецям", кааператыў "Санет".

Бывай, КВЗ! Мы яшчэ сустрэнемся!

І.БАРКОЎСКІ,
настаўнік мінскай гімназіі №198.

НГ-ІНФАРМ

ВЕСТКІ

З ГРОДНІ...

Свой першы экзамен здалі больш як 500 вучняў адзінаццатых класаў школ Ленінскага раёна Гродні. У навучальна-вытворчых камбінатах яны атрымалі пасведчанні токараў, вадзіцеляў аўтамабіляў і іншых прафесій. Сярод новых спецыяльнасцяў — менеджэр, бармэн, аператар ЭВМ.

***

Амаль усе факультэты Гродзенскага дзяржуніверсітэта далі згоду, каб сярод іншых навучальных дысцыплін было і выяўленчае мастацтва. Асабліва з вялікім энтузіязмам за гэта выказваюцца матэматыкі і фізікі. А вось філолагі зацікаўленасці не праяўляюць...

***

У наступным навучальным годзе ў шасці школах абласнога цэнтра плануецца адкрыццё першых класаў з польскай мовай навучання. Пакуль ідзе набор дзяцей у гэтыя класы.

***

Пры Лідскім Доме культуры дзейнічае дзіцячы ансамбль эстраднага танца "Натхненне". На аглядзе-конкурсе юных талентаў горада "Хрустальны чаравічак" дэбютанты атрымалі перамогу.

***

У Баранавічах прайшоў рэспубліканскі конкурс навучэнцаў дзіцячых музычных школ па класу духавых інструментаў. У ліку пераможцаў па класу флейта — Яўген Мельнік са Смаргоні.

***

Нядаўна Дзятлаўскую школу-інтэрнат наведалі госці з Люксембурга, прадстаўнікі скаўцкага руху. Яны ўручылі дзецям падарункі. Была дасягнута дамоўленасць, што летам у Люксембург зноў на адпачынак прыедуць падлеткі з Дзятлава.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ.

...З ГОМЕЛЯ

Фальклорны гурток "Весялінка" створаны ў дзіцячым садзе №14 чатыры гады назад. Ён заўсёды радуе маленькіх гледачоў цікавымі выступамі. Музычны работнік В.Д.Шкурко і выхавацельніца В.П.Халюшкова шмат часу аддаюць нацыянальнаму адраджэнню, знаёмяць малышоў з народнымі абрадамі і традыцыямі.

***

Навабеліцкі Дом дзіцячай творчасці правёў выставу-справаздачу. Тут было многа малюнкаў, вышываных ручнікоў, мяккіх цацак, прыгожых пано, вырабаў з дрэва. Незвычайнае свята закончылася цікавымі конкурсамі, віктарынамі і дэманстрацыяй мод.

***

У сярэдняй школе №3 адбыўся злёт юных абаронцаў Айчыны, ветэранаў вайны і працы. Вучні іх віталі кветкамі, музыкай і песнямі. Удзельнікі злёту правялі ў школе "Урокі мужнасці".

***

Клуб "Да таямніц Прыроды" працуе на абласной станцыі юных турыстаў. Дзеці вывучаюць флору Беларусі, збіраюць насенне раслін, занесеных у Чырвоную кнігу, а затым высяваюць іх. Кіруе клубам інжынер-механік А.Л.Семянцоў.

***

Закончыліся заняткі ў школе міласэрнасці, якая была створана камітэтам Чырвонага Крыжа Савецкага раёна. Хлопчыкі і дзяўчынкі навучыліся аказваць першую медыцынскую дапамогу, наведалі Дом для састарэлых, расшырылі сваё светаўспрыманне і павысілі культурны ўзровень.

***

На базе дзіцячага сада №27 дзейнічае новая выхаваўча-адукацыйная ўстанова "Спецяслі-сад-пачатковая школа". Сёння тут вучацца і выхоўваюцца дзеці з парушэннем зроку, постаці і алергетыкі. Дырэктар Л.М.Жалязнова лічыць, што дзецям у садку-школе будзе вельмі добра. Яны змогуць тут вучыцца да 4 класа, паралельна пройдуць належны курс аздараўлення і медыцынскага лячэння.

Ганна АТРОШЧАНКА.

МОВА ЖЫВЕ

На такую тэму прайшоў семінар у Горацкай гімназіі №1. У ім прынялі ўдзел настаўнікі пачатковых класаў школ горада і раёна. Яны пабывалі на занятках гуртка "Беларусазнаўства" ў 2"В" класе (настаўніца першай катэгорыі Г.А.Кісялёва), на ўроку ў пачатковых класах па новым прадмеце "Мая Радзіма Беларусь" (настаўнік вышэйшай катэгорыі В.Я.Дзятліковіч).

Затым настаўнікі гімназіі расказалі аб той рабоце, якая праводзіцца ў пачатковых класах па прывіцці любові да сваёй Радзімы і роднай мовы. Пачынаецца яна з паступлення вучняў у першы клас. У кожным з іх арганізаваны гурток "Беларусазнаўства", мэта якога — пазнаёміць дзяцей з беларускімі народнымі гульнямі, карагодамі, лічылкамі, паказаць прыгажосць роднай мовы і адначасова развіць творчыя здольнасці вучняў, іх памяць, замацаваць навыкі беларускага маўлення, даць элементарнае ўяўленне аб навакольным свеце праз гульні.

А ў 1 і 2 класах — гэта ў асноўным гульні, загадкі, скараговркі, прыказкі і прымаўкі, інсцэніраванне беларускіх казак, карагодныя звычаі, вясёлыя музычныя раніішнікі. Вытокі вялікай колькасці народных гульняў ляжаць у абрадавай паэзіі. Асабліва многа іх звязана з народным календаром.

Удзельнікі семінара прысутнічалі таксама на занятках гуртка ў 3 класе і на ўроку ў 4 "В" класе. Формы заняткаў былі самыя разнастайныя. А затым вучні і ўсе ўдзельнікі праводзімага мерапрыемства адправіліся ў вандроўку па гістарычным мінулым сваёй Радзімы — ад славянскіх плямёнаў праз Полацкае княства, Рэч Паспалітую, Вялікае княства Літоўскае да БССР і сучаснай Беларусі.

Г.ГРЫБАВА,
намеснік дырэктара Горацкай гімназіі №1 па пачатковых класах.

Супрацоўніцтва

У ІНСТЫТУТ — ДАТЭРМІНОВА

Трэці год некаторыя сярэднія школы Жлобіна супрацоўнічаюць з Гомельскім політэхнічным інстытутам.

Сутнасць такога супрацоўніцтва заключаецца ў тым, што вышэйшая навучальная ўстанова пры дапамозе мясцовых настаўнікаў наладжвае для вучняў курсы па дадатковым вывучэнні фізікі і матэматыкі. Затым вучням прадастаўляецца магчымасць (у маі месяцы) здаваць экзамены і па іх выніках (яшчэ да атрымання атэстата аб сярэдняй адукацыі) быць залічаным на першы курс інстытута.

Па словах намесніка загадчыка Жлобінскага гарана М.Д.Саўкова, сёлета такую магчымасць выкарысталі больш дзесяці вучняў. Дзейсную дапамогу ім у падрыхтоўцы аказалі настаўніца матэматыкі сярэдняй школы №5 М.Д.Дацэнка і дырэктар сярэдняй школы №2 настаўнік фізікі У.Р.Бегуноў.

Мікалай ШУКАНАЎ,
супрацоўнік жлобінскай райгазеты "Новы дзень".

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

НА ГРАНІ НАВУКОВАЙ СЕНСАЦЫІ

МАЛЕНЬКІ КАВАЛАЧАК ГЭТАЙ СЕНСАЦЫІ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ГЕАЛАГІЧНЫМ МУЗЕІ БРЭСЦКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА

Да чаго ж прыгожы бурштын — выкапнёвая смала старажытных хваёвых дрэваў! У яго няма асляпляльнага бляску дыяменту алмазу і фантастычнага зіхацення святла александрыту, але многія тысячагоддзі, пачынаючы з далёкага палеаліту, чалавек цаніў бурштын за яго спакойную цеплыню, якая нібы захоўвае ў сабе сонечнае святло. І ці не таму самыя паэтычныя легенды прысвяціла чалавецтва менавіта бурштыну, яго паходжанню, тлумачэнню разнастайнасці яго колераў і адценняў, якія мінералагі і гемолагі налічваюць не менш як 350!

Да апошняга часу лічылася, што бурштын і бурштынападобныя смолы ўтварыліся ў мел-палеагенавы час, г.зн. 70 — 40 мільёнаў гадоў таму назад. У адкладаннях гэтага ўзросту ён сустракаецца ў глаўканітавых глінах, вуглістых утварэннях, пясчана-гліністых пародах, сярэдне- і дробназярністых пясках з галькай і гравіем.

Некалькі гадоў таму ў буйнейшым мінералагічным музеі і геалагічныя інстытуты свету з Германіі былі дастаўлены невялічкія пласцінкі з дробнымі зярняткамі паўпразрыстага і няпразрыстага цёмна-карычневага бурштыну. Атрымала такую пласцінку і геалагічная лабараторыя кафедры геаграфіі Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.С.Пушкіна. Гэта было своеасаблівым прызнаннем нашых даследаванняў па вывучэнні бурштынаноснасці паўднёва-заходніх тэрыторый Беларусі. А вось пералік некаторых музеяў і інстытутаў, удастоеных гэтай пасылкі, аб каштоўнасці і незвычайнасці якой будзе расказана крыху ніжэй: прыродазнаўча-гістарычны музей Нью-Йорка (ЗША), інстытут палеанталогіі Венскага універсітэта (Аўстрыя), Палеанталагічны музей Санкт-Пецярбурга (Расія), Варшаўскі музей Зямлі (Польшча), інстытут палеанталогіі Універсітэта ў Цюрыху (Швейцарыя), Музей прыродазнаўства Штутгарта (Германія), прыродазнаўча-гістарычны музей Лондана (Вялікабрытанія), Інстытут геалагічных навук Акадэміі навук Беларусі і іншыя, не менш вядомыя навуковыя арганізацыі.

Незвычайнасць пласцінкі з бурштынам заключаецца ў тым, што ўзоры былі выяўлены ў так званых кейпераўскіх адкладаннях карнійскага яруса позняга трыясу (230—225 мільёнаў гадоў таму), г.зн. узрост прысланага бурштыну старэйшы за агульнавядомыя бурштыны свету на 160—190 мільёнаў гадоў.

Аўтар знаходкі Ульф Крысціян Байер паведаміў, што бурштын ён выявіў сярод пясчанікаў у гарах Шлірзее на вышыні 930 метраў над узроўнем мора. Пароды, якія складаюць геалагічны разрэз гэтага ўчастка, прадстаўлены, акрамя пясчаніка з бурштынам, мергелямі, гіпсам з дробнымі праслойкамі соляў, глінамі і даламітамі, г.зн. з'яўляюцца пародамі, якія адносяцца да тыповых лагунных фацый. Значыць, у тыя далёкія гады берагі старажытных лагун Германіі былі пакрыты лясамі голанасенных раслін, якія прадуцыравалі жывіцу, што стала потым бурштынаноснай смалой — самай старажытнай па ўзросту. Старанна вывучаючы палеагеаграфію розных рэгіёнаў свету, аўстрыйскі геолаг Э.Майсісовіч яшчэ ў 1869 годзе ўпершыню выдзеліў Карнійскі ярус позняга трыясу. Ці думаў тады славуты вучоны, што менавіта там пазней будуць знойдзены самыя старажытныя ўзоры бурштыну?

Намі гэты ўнікальны матэрыял быў старанна даследаваны: бурштын вельмі крохкі, паверхня пакрыта тонкай рэакцыйнай плёнкай, што сведчыць аб яго павярхоўным акісленні. Зерні і іх абломкі маюць няправільную, вуглаватую і востравугольную форму, абмежаваную паверхнямі ракавістага і няроўнага злому. Колерная гама даволі аднастайная: цёмна-карычневыя, карычнева-бурыя і бурыя таны. Практычна ўсе зерні характарызуюцца дрэннай празрыстасцю. Хімічным элементарным аналізам у даследуемым бурштыне ўстаноўлены наступныя элементы (у %): вуглярод — 78,88, вадарод — 9,71, кісларод — 11,41 пры адсутнасці азоту і серы. Адсутнасць або малое ўтрыманне серы ў бурштынах тлумачыцца асаблівасцямі асяроддзя захавання і рознай флюідапранікальнасцю бурштынаўтрымліваючых парод. Дарэчы, многія бурштыны поўдня Беларусі маглі ўтварыцца ў лагуннай частцы палеагенавага мора, а затым пераадкладвацца водна-ледніковымі патокамі ў месцы іх сённяшніх знаходак.

Для таго, каб прагназіраваць і паспяхова знаходзіць новыя залежы бурштыну, важна ведаць усе тайны "бурштынавага лёсу". Адной з галоўных такіх тайнаў быў адказ на пытанне: чаму бурштынаўтварэнне прыпадала на даволі вузкі інтэрвал геалагічнай гісторыі Зямлі ў 30 — 100 мільёнаў гадоў? Знаходка ж бурштыну ў трыясавых адкладаннях Германіі рассоўвае гэтыя часавыя рамкі больш чым на 200 мільёнаў гадоў і расшырае арэалы распаўсюджання тых самых дрэў, якія так багата выдзялялі бурштынаносную жывіцу. Разгадка гэта адной з тайнаў эвалюцыйнага ходу развіцця раслін або, наадварот, новая загадка — нам трэба будзе яшчэ разабрацца. Але сам факт гэтай дзіўнай знаходкі — на грані навуковай сенсацыі. І маленькі, "непрывабны" кавалачак гэтай сенсацыі ў выглядзе невялікіх кавалачкаў бурштыну знаходзіцца ў геалагічным музеі Брэсцкага Дзяржаўнага педінстытута.

Альберт БАГДАСАРАЎ,
прафесар.

СТРАСЁМ ЯЕ ПРАХ З НАШЫХ НОГ?

МЕТОДЫКА КАЛЕКТЫЎНАГА ТВОРЧАГА ВЫХАВАННЯ МОЖА АДЫГРАЦЬ ВЯЛІКУЮ РОЛЮ Ў СТВАРЭННІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ШКОЛЫ

Апошнім часам усё часцей задумваюся над дзіўным лёсам методыкі калектыўнага творчага выхавання, створанай выдатным педагогам-вучоным Ігарам Пятровічам Івановым. Двойчы за параўнальна невялікі адрэзак часу яна літаральна захоплівала розумы і сэрцы тысяч педагогаў і іх выхаванцаў. Здавалася б, гэтае павальнае захапленне павінна было вырасці ў значную з'яву сучаснай педагогікі, але гэтага не адбылося. Зразумела, паўстае пытанне — чаму? Упэўнены, пройдзе час, і феномен методыкі Іванова стане прадметам сур'ёзнага даследавання. Аўтар не прэтэндуе на навуковы аналіз спадчыны І.П.Іванова. Гэта суб'ектыўныя нататкі настаўніка сельскай школы, для якога методыка калектыўнага творчага выхавання стала крыніцай жывой вады, якая дазваляе жыць і працаваць у наш смутны час.

Не выпадкова, што паяўленне методыкі Іванова ў айчыннай педагогіцы звязана са спробамі дэмакратычных пераўтварэнняў. Узнікнуўшы ў гады хрушчоўскай адлігі, пасля доўгіх гадоў усеагульнага страху і жорстка рэгламентаванага існавання ў рамках таталітарнага рэжыму, яна адпавядала надзеям і спадзяванням на свабоднае развіццё асобы, нацэленай на ідэалы гуманізму. "Чалавек чалавеку — сябар, таварыш і брат". Будучы дзецішчам свайго часу, методыка несла ў сабе і ілюзіі 60-х гадоў. Адсюль і рамантызацыя 20-х гадоў, атрыбутыка і тэрміналогія перыяду грамадзянскай вайны. І гэта не было праяўленнем канфармізму.

Тады мы — хлапчукі, якія стваралі разам са сваімі старэйшымі таварышамі-педагогамі камуны, верылі, што пасля смерці У.І.Леніна на чале дзяржавы аказаліся людзі, якія сказілі камуністычную ідэю, узвялі ў закон няпраўду і насілле. Будзёнаўкі, якія мы з гордасцю насілі, былі для нас сімвалам адраджэння Праўды. Адліга, што прыгрэла нас у самым пачатку жыццёвага шляху, аказалася недаўгачасная. Тады перамаглі кансерватыўныя сілы, і методыка Іванова аказалася "не да кампаніі" і не да часу. У камунарскіх калектывах убачылі пагрозу дзіцячым камуністычным арганізацыям з іх зручным для ўлады прынцыпам дэмакратычнага цэнтралізму і партыйнай дысцыплінай. Афіцыйна методыку ніхто не забараняў, але было зроблена ўсё, каб пра яе забылі. Аднак дзецішча Іванова не канула ў небыццё. Больш таго, методыка працягвала развівацца. Менавіта ў гэты час яна набывае выгляд цэласнай, навукова абгрунтаванай тэорыі выхавання. З'яўляюцца работы С.А.Шмакава, У.Ф.Мацвеева, А.С.Газмана, У.А.Каракоўскага, С.Л.Салавейчыка, цесна звязаныя з ідэямі І.П.Іванова. Жыццяздольнасць методыкі была пацверджана тым фактам, што ў перыяд з 1986 па 1991 гг. яна перажыла свой другі ўзлёт. Патрэбнасць у выхаванні "грамадзянына адукаванага, актыўнага, які шукае, умее жыць і працаваць ва ўмовах дэмакратыі, гаспадарчай самастойнасці калектываў, у абстаноўцы ўзрастаючай эканамічнай і сацыяльнай адказнасці за сябе і за краіну" (М.С.Гарбачоў), прымусіла педагогаў зноў звярнуцца да ідэй калектыўнага творчага выхавання. Вясной 1989 года ў Гомелі праходзіў першы і, на жаль, апошні з'езд творчага аб'яднання педагогаў рэспублікі. Шмат выдатных педагогаў і цікавых выступленняў было на гэтым зборы, але мяне тады асабліва прыцягнула выступленне башкірскага вучонага Т.В.Акбашава, у якім адзначалася, што навучальны прадмет з'яўляецца не мэтаю, а сродкам для дасягнення наступных задач — кожны вучань павінен развіваць на любым узроўні:

а) здольнасць да фіксацыі цяжкасцяў, што ўзнікаюць у жыццёвых сітуацыях;
б) здольнасць вылучаць з аналізу сітуацыі праблему;
в) здольнасць выстаўляць гіпотэзы;
г) здольнасць да праверкі і ацэнкі гіпотэзы;
д) здольнасць да прыняцця рашэнняў па пераадоленні перашкод, якія ўзнікаюць у ходзе рэалізацыі задачы.

Бадай, ніхто не будзе пярэчыць, што менавіта такія здольнасці і неабходна развіваць у грамадзян нашай дзяржавы, якая фармуецца, а школа павінна выканаць гэты сацыяльны заказ. Тады ж, у Гомелі, Т.Акбашаў указваў на блізкасць сваёй канцэпцыі няспыннай адукацыі як кааперацыі, што развіваецца да ідэй калектыўнага творчага выхавання. Каб не быць галаслоўным, дазволю сабе нагадаць стадыі калектыўнай творчай справы. На першай стадыі вызначаюцца тыя жыццёва-практычныя задачы-справы, якія неабходны калектыву для цікавага, насычанага жыцця. Другая стадыя — калектыўнае планаванне, дзе кожны мае права выказаць сваю думку па вырашаемых праблемах, а затым мажлівасць прыйсці да прымальнага ўсімі членамі калектыву рашэння. Калектыўная падрыхтоўка КТС (трэцяя стадыя) мяркуе свабодны выбар кожным вучнем узроўню свайго ўдзелу ў праводзімай справе з улікам сваіх здольнасцяў, інтарэсаў і магчымасцяў. Чацвёртая стадыя — правядзенне КТС, а пятая — калектыўны аналіз. Апошняя стадыя — гэта максімальнае выкарыстанне выхаванцамі ў навучальнай рабоце і пазашкольнай дзейнасці набытага ў ходзе рэалізацыі КТС вопыту. Як бачым, блізкасць спіралі Акбашава (мэтамеркаванне — планаванне — рэалізацыя плана — аналіз — вызначэнне новай мэты) са стадыямі КТС Іванова ў наяўнасці. У такім выпадку ўзнікае пытанне: "Чаму сёння, калі, як ніколі, востра стаіць праблема выхавання падрастаючага пакалення, мы так лёгка развітваемся з методыкай, якая здольна дапамагчы нам у вырашэнні гэтай праблемы?"

Часцей за ўсё ў адказ чуюцца абвінавачанні ў камуністычнай накіраванасці методыкі. Пры гэтым спасылаюцца на тое, што сам І.П.Іваноў указваў сваё дзецішча комплексным падыходам да працэсу камуністычнага выхавання. Адсюль напрошваецца выснова — паколькі ў жніўні 1991 года мы развіталіся з камуністычнай ідэалогіяй, то з методыкай Іванова, як прадуктам данай ідэалогіі, пытанне зразумелае. Страсем яе прах з нашых ног. Калі чуеш гэта з вуснаў людзей недасведчаных, якія часта мяркуюць аб методыцы толькі па назве камунарская, то ўзнікае пачуццё прыкрасці. Што зробіш, некампетэнтнасць і ваяўнічае невуцтва працягваюць быць бічом нашага грамадства. Тлумачыць што-небудзь такім людзям — справа безнадзейная і няўдзячная. Іншая справа, калі гэтыя думкі ўзнікаюць у асяроддзі блізкіх людзей, калег па рабоце. Пасля выхаду ў свет "Настаўніцкай газеты" са справаздачай аб "круглым стале", праведзеным напярэдадні 70-годдзя з дня нараджэння І.П.Іванова, да мяне пачалі звяртацца адносна пазіцыі, выказанай М.А. Гусакоўскім, чалавекам аўтарытэтным у педагагічных колах. Справядліва адзначыўшы, што "фактычна за семдзесят гадоў у нас не створана ніводнай такой дакладнай тэорыі і методыкі выхавання, як у І.П.Іванова", Міхаіл Антонавіч заявіў, што "камунарскую методыку трэба перапісаць нанава. Справа ў тым, што ў самім слове камунарская быў закладзены пэўны сэнс... Але ідэя камунізму загадала доўга жыць, таму ідэалогія камунарства сама сябе адвергнула. Парадокс у тым, што, паводле задумы аўтара, у гэтай методыцы ідэалогія катэгарычна сама сябе адвергнула, і засталася методыка калектыўных творчых спраў, і не болей". Па-першае, аб ідэалогіі. Сапраўды, Ігар Пятровіч распрацаваў комплексны падыход да працэсу камуністычнага выхавання. Інакш у тыя гады гэта і не магло называцца, але давайце разбяромся, у чым бачыў Іваноў сутнасць камуністычнага выхавання. Аказваецца, у клопаце выхаваценяў і выхаванцаў аб паляпшэнні навакольнага жыцця. Калі гэтая ідэалогія (пераўтварэнне жыцця на карысць і радасць далёкім і блізкім людзям) камуністычная, то камуністам трэба лічыць Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага, якому належаць наступныя словы: "Палюбіць чалавека, як самога сябе, па запаведзі Хрыстовай, — немагчыма. Закон асобы на зямлі звязвае. І перашкаджае... Між тым — найважнейшае ўжыванне, якое можа зрабіць чалавек са сваёй асобы, з паўнаты развіцця свайго Я, гэта аддаць яго цалкам і поўнасцю ўсім і кожнаму непадзельна і беззапаветна. І гэта найвялікшае шчасце. Такім чынам, закон Я зліваецца з законам гуманізму... Вось тут і раўнавага зямная. Інакш зямля была б бессэнсоўная".

Калі ж мы навучымся аддзяляць зерне ад пустазелля і будзем адрозніваць тыя гуманістычныя прынцыпы, якія былі закладзены і ў камуністычнай ідэі (інакш яна не была б такой прывабнай на працягу многіх стагоддзяў), і тую д'ябальскую практыку, сведкамі якой былі нашы бацькі і мы самі. Па-другое, як гэта ні парадаксальна, але І.П.Іваноў ніколі не быў аўтарам "камунарскай методыкі". Сам тэрмін належыць аўтару кнігі пра камуну юных фрунзенцаў С.Л.Салавейчыку. У адной з апошніх сваіх работ Ігар Пятровіч пісаў: "Як пераканаўча даказвала практыка арганізацыі выхаваўчых адносін, адным з дзейсных метадаў гуманна-дэмакратычнага выхавання з'яўляецца так званая камунарская методыка. Больш правільна камунарскую методыку трэба называць педагогікай калектыўнага творчага жыцця". У апошнія гады, размаўляючы з калегамі па КАМПЛСу (камунарска-макаранкаўскай педагагічнай асацыяцыі Беларусі), я пастаянна лавіў сябе на думцы, што, гаворачы пра методыку, мы гаворым пра розныя методыкі. Давайце вернемся да вытокаў з'яўлення так званай "камунарскай методыкі". У 1962 годзе ў "Арлёнак" прыехала група кюфаўцаў. К гэтаму часу І.П.Іваноў КЮФ пакінуў. Чаму — гэта тэма асобнай размовы. Ленінградскія камунары, сярод якіх не было ніводнага педагога, прывезлі ва ўсерасійскі піянерскі летнік вопыт свайго калектыўнага жыцця, г.зн. сваё успрыняцце адкрыцця І.П.Іванова. Тыя, хто потым распаўсюдзіў па ўсёй краіне камунарства, прывезлі ў свае школы тэхналогію калектыўных творчых спраў, законы і традыцыі, сістэму самакіравання ленінградскіх камунараў. Педагагічныя аспекты работы Іванова ў той час засталіся невядомымі. Вось гэты прадукт дзіцячай і важацкай творчасці і атрымаў назву "камунарская методыка". У васьмідзесятыя гады ідэя І.П.Іванова ажыццяўлялася зноў жа на ўзроўні гэтага ўрэзанага варыянта, а ён (тут я з Міхаілам Антонавічам згодзен) сябе вычарпаў. Атрымліваючы яркае ўвасабленне на зборах, г.зн. ва ўмовах аўтаномнасці, яна не прыжывалася ва ўмовах штодзённага жыцця масавай школы. Паводле вызначэння С.Д.Палякова, зборы — гэта "сітуацыя-узор". Але было б недарэчна спрабаваць пераварыць усё разнастайнае жыццё школы ва ўзор. Методыку Іванова не трэба перапісваць нанава. Трэба вярнуцца да арыгінала, да методыкі калектыўнага творчага выхавання, разлічаную на прымяненне ва ўмовах жыцця школьнага калектыву, і якую мы ведаем дрэнна. Галоўная прычына таго, што адкрыццё Іванова не знайшло дастойнага ўвасаблення ў педагагічнай практыцы, тоіцца не ў ідэалагічным аспекце, а ў элементарным няведанні педагагічных асноў работы таленавітага педагога-вучонага.

Зараз многія захапляюцца ідэямі М.Мантэсоры, С.Фрэне, Р.Штайнера і г.д. Гэта цудоўна, што вопыт замежнай педагогікі становіцца здабыткам нашай школы, але мяне непакоіць другое. Ці не паўтараецца і тут памылка, што адбылася з методыкай Іванова, калі на хвалі педагагічнай моды настаўнікі спрабуюць укараніць нейкі эрзац-прадукт, а, не атрымаўшы чакаемых вынікаў, кідаюць распачатую работу, вінавацячы каго хочаце, але не сябе.

Пішу гэтыя нататкі з адною мэтаю — быць пачутым тымі настаўнікамі, якія не ганяюцца за модай і не пагразлі ў мітусні смутнага часу. Методыка калектыўнага творчага выхавання можа адыграць велізарную ролю ў стварэнні беларускай нацыянальнай школы. Асабліва ў пераходны перыяд рэформы. Але гэта будзе магчыма толькі ў тым выпадку, калі мы будзем яе ведаць і творча выкарыстоўваць.

Уладзімір ЧМІЛЬ,
настаўнік Каменскай школы Бабруйскага раёна.

Нядаўна ў Асарэвічах на базе мясцовай школы прайшоў семінар дырэктараў школ Брагінскага раёна. Размова ішла пра тое, як у няпростых умовах нашай рэальнасці, пры недахопе кадраў і сродкаў, можна весці работу з вучнямі па нацыянальным адраджэнні.

У Асарэвіцкую школу госці прыехалі не дарэмна — тут ёсць што паказаць калегам. Гэта і невялікі музей рамёстваў, і экспазіцыя, прысвечаная вызваленню роднага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вучні паказалі дырэктарам народныя абрады.

Думка пра тое, што школа павінна апераджаць працэсы нацыянальнага адраджэння, якія ідуць у грамадстве, знайшла водгук сярод удзельнікаў семінара.

Юрый БОНДАРАЎ.

ВЫКЛАДЧЫКУ ГІСТОРЫІ

"Вельмі строга караць, не спыняючыся ні перад чым"

ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ САВЕЦКАЙ ЭКАНОМІКІ

У 1920 г. у рабоце "Эканоміка пераходнага перыяду" Бухарын пісаў: "Пралетарскі прымус ва ўсіх сваіх формах, пачынаючы ад расстрэлаў і канчаючы працоўнай павіннасцю, з'яўляецца, як ні парадаксальна гэта гучыць, метадам выпрацоўкі камуністычнага чалавецтва з чалавечага матэрыялу капіталістычнай эпохі". Развіццё савецкай дзяржавы пацвердзіла гэты тэзіс.

Адносіны да народа як да сыравіны для ажыццяўлення намечаных генеральнай лініяй палітычных і эканамічных пераўтварэнняў былі адной з галоўных рысаў савецкай таталітарнай сістэмы.

Ва ўмовах скасавання прыватнай уласнасці, стварэння адміністрацыйна-размеркавальнай палітызаванай эканомікі адсутнічалі натуральныя формы павышэння прадукцыйнасці працы. Матэрыяльнае стымуляванне працоўнай дзейнасці разглядалася як адзін са шляхоў, што вядзе да ўзнікнення "багатых". Каб гэтага не здарылася, асноўным арганізатарам працоўнага працэсу стала сацыялістычная дзяржава, якая для яго стымулявання абрала прымус.

У даваенны перыяд сфармаваліся розныя формы прымусовай працы, абумоўленыя характарам і асаблівасцямі грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. У перыяд "ваеннага камунізму" дамінавалі "мілітарызацыя працы", "працоўная павіннасць", ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі вызначыліся прынцыпы "перавыхавання працай", якія ў 30-я гады былі пакладзены ў аснову ўтварэння сістэмы дзяржаўных устаноў па выкарыстанні працы зняволеных. У канцы 30-х гадоў дзяржава зноў вяртаецца да мілітарызаванай працы, актывізуючы для гэтага барацьбу за працоўную дысцыпліну.

Канстытуцыйнае права на працу заўсёды разглядалася ў савецкай дзяржаве перш за ўсё як абавязак. Развіццё таталітарнай сістэмы пераварыла гэты абавязак у прамы прымус, які стаў неабходным звяном савецкай эканомікі.

Пачатак фармавання савецкай дзяржаўнай сістэмы праходзіў ва ўмовах ваеннага часу. Падпарадкаванне эканомікі патрэбам фронту адбілася не толькі на прыярытэтнай арыентацыі эканамічнага развіцця на прадукцыю, неабходную для задавальнення ваенных. У арганізацыю працоўнага працэсу, якая цалкам перайшла ў рукі дзяржавы, былі ўключаны элементы, характэрныя для армейскіх структур.

"Для забеспячэння няспыннай дзейнасці ўсёй гаспадарчай сістэмы" дэкрэтам СНК ад 20 чэрвеня 1918 г. была ўведзена ўсеагульная працоўная павіннасць: грамадзяне ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў залічваліся ў працоўнае апалчэнне, на іх заводзіліся спецыяльныя карткі. У кастрычніку 1918 г. Дэкрэтам СНК узамен пасведчання асобы ўводзіліся працоўныя кніжкі, у якія заносіліся запісы аб тым, якая праца чалавекам была зроблена. Беспрацоўным, зарэгістраваным на біржы працы, забаранялася адмаўляцца ад работы. Спецыялісты,якія не хацелі працаваць у галіне сваёй прафесіі, прымусова выкарыстоўваліся там, дзе патрабаваліся вялікая фізічная нагрузка і нізкая кваліфікацыя працуючых. У снежні 1918 г. пасля зацвярджэння УЦВК "Кодэкса законаў аб працы" працоўная павіннасць распаўсюджвалася ўжо на ўсіх працаздольных грамадзян РСФСР ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў.

У канцы 1918 г. пачынае практыкавацца "мабілізацыя" — абавязковае прыцягненне да працы асоб пэўных спецыяльнасцяў: тэхнічных, сельскагаспадарчых і інш. Спіс "мабілізаваных" прафесій складаў СНК.

Для вырашэння неадкладных задач, якія мелі "вялікае грамадскае значэнне" (расчысткі вуліц, чыгунак ад снегу, нарыхтоўкі паліва, перавозкі шматлікіх дзяржаўных чыноўнікаў) прымянялася так званая дзяржаўная працоўная павіннасць: спецыяльнай пастановай Савета Абароны ўсе грамадзяне павінны былі адбываць натуральную дравяную, працоўную па нарыхтоўцы паліва і гужавую павіннасці.

У пачатку 20-х гадоў Чырвоная Армія дабілася рашаючых перамог на франтах грамадзянскай вайны, закончылася вайна з Польшчай, ваенная патрэбнасць ва ўтрыманні шматмільённай армії адпала. Каб захаваць армію для ўдзелу ў будучай "сусветнай рэвалюцыі", пачалі стварацца "працоўныя арміі", сутнасць якіх заключалася ў выкарыстанні армейскіх падраздзяленняў на працоўным "фронце".

Умацаванне цэнтралізацыі і адзінаначалля было непарыўна звязана з удасканаленнем метадаў прымусу, з дапамогай якіх дзяржава магла б дабіцца эфектыўнага гаспадарчага кіравання. Шырокае распаўсюджанне атрымлівае інстытут палітычных камісараў, прыўнесены з армейскай сферы ў народнагаспадарчую.

Камісарам прадастаўляліся вялікія правы. У спецыяльным Палажэнні Савета Абароны ўказвалася, што накладванне дысцыплінарных спагнанняў з'яўляецца "не толькі правам, але і абавязкам камісараў", якія ў выпадку парушэння працоўнай дысцыпліны або правілаў тэхнічнай эксплуатацыі падведамнага ім службовага штата "самі падлягаюць адказнасці ў адміністрацыйным парадку як за нераспараджальнасць і патуранне". Асобы тэхнічнай адміністрацыі маглі накладваць дысцыплінарныя спагнанні "толькі са згоды адпаведнага камісара". Устанаўліваліся віды дысцыплінарных спагнанняў, якія мог накладваць камісар, у тым ліку звязаныя і з пазбаўленнем волі: ад 7 дзён да 1 месяца.

З мэтай устанаўлення цвёрдай вытворча-выканаўчай дысцыпліны спачатку найбольш важныя галіны народнай гаспадаркі, а затым і іншыя, былі мілітарызаваны. Мілітарызацыя пад пагрозай крымінальнага пакарання пазбаўляла работнікаў прадпрыемстваў права па сваім жаданні мяняць месца службы, абавязвала няўхільна выконваць распараджэнні кіраўніцтва, вытворчыя заданні, захоўваць працоўную дысцыпліну.

Вопыт РСФСР адразу пачаў выкарыстоўвацца ў Савецкай Беларусі. Каб наладзіць улік рабочай сілы і папярэдзіць ухіленні ад абавязковай працоўнай павіннасці, Камісарыят Працы 16 лістапада 1920 г. выдаў загад, які абавязваў рабочых, служачых і навучэнцаў мець на руках пасведчанне аб рабоце з чарговай візай. Устанаўліваецца таксама парадак рэгістрацыі і ўліку грамадзян, якія не маюць работы. Правам прыцягваць да выканання працоўнай павіннасці валодалі старшыні Саветаў усіх узроўняў і мясцовыя аддзяленні Наркамата Працы.

27 лютага 1920 г. быў цыркулярна разасланы ўсім губчэка і іх агентам на месцах загад прэзідыума ВЧК №20. У цыркуляры растлумачвалася, што працоўная павіннасць уводзіцца для барацьбы з "гаспадарчай разрухай — спадчынай імперыялістычнай вайны". Каб загад аб усеагульнай працоўнай павіннасці "не заставаўся толькі на паперы", "кожны чэкіст абавязаны сачыць удзень і ўначы за тым, каб грамадзяне і ўстановы дакладна і беспярэчна выконвалі ўсе пастановы і дэкрэты Рабоча-Сялянскага Урада, а таму Прэзідыум ВЧК гэтым прадпісвае Вам пільна сачыць за дакладным выкананнем грамадзянамі і ўстановамі ўсіх пастаноў Цэнтральнай улады аб працоўнай павіннасці. Вельмі строга караць усіх парушальнікаў і невыканаўцаў гэтых пастаноў, не спыняючыся ні перад чым".

"Працоўная павіннасць" дазваляла аператыўна ліквідоўваць прарывы ў развіцці сацыялістычнай эканомікі. Аднак, як і любое іншае прымусовае ўздзеянне, яна была нізкапрадукцыйнай.

Развіццё НЭПа наглядна засведчыла неэфектыўнасць мілітарызаванай працы. Людзі хацелі добра жыць, карыстацца якаснымі рэчамі. У прыватнікаў яны былі лепшымі, прыватная сфера паслуг працавала больш дакладна. Дзяржаўная эканоміка пачала перабудоўвацца. Працоўныя арміі, палітычныя камісары праіснавалі да 1925 г.

Але пераходзіць да эканамічнага рэгулявання развіцця народнай гаспадаркі бальшавікі не збіраліся.

Пачалася маштабная барацьба за працоўную дысцыпліну.

У пачатку верасня 1928 г., пасля прыняцця ЦВК і СНК СССР пастановы аб умацаванні працоўнай дысцыпліны, НК Юстыцыі БССР выдаў цыркуляр аб барацьбе з парушальнікамі. Канстатуючы, што "за апошні час выпадкі спаду працоўнай дысцыпліны, прагулаў, хуліганства, п'янства і шэраг іншых з'яў, якія шкодна адбіваюцца на рабоце прадпрыемстваў і арганізацый" пачасціліся, НКЮ прапанаваў шэраг мер па іх ліквідацыі. Цяпер пры звальненні за хуліганства, шкодніцтва і наўмысны падрыў вытворчай дысцыпліны адміністрацыя абавязана была паведаміць у следчыя органы для прыцягнення вінаватых да крымінальнай адказнасці. Следства па гэтых справах ажыццяўлялася ў "тэрміновым парадку".

Да кантролю за выхаваннем працоўнай дысцыпліны прыцягваліся і спецслужбы. Спецзводкі "Аб стане працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах БССР" паступалі непасрэдна да сакратароў ЦК КП(б)Б.

У пачатку 30-х гадоў для наладжвання працоўнай дысцыпліны побач з рэпрэсіямі прымяняліся і эканамічныя метады. Аднак эканамічае ўздзеянне ва ўмовах таталітарнай сістэмы не прыжылося: дзяржава аддала перавагу больш радыкальным метадам. 23 лістапада 1932 г.у Кодэкс аб працы (у рэдакцыі 1929 г.) быў унесены новы артыкул — аб прагулах: "У выпадку аднаго дня няяўкі на работу без уважлівых прычын (прагул) работнік падлягае звальненню з пазбаўленнем яго права карыстацца прадуктовай і прамысловай карткамі і выселеннем з кватэры, прадастаўленай па месцы работы".

Прынятыя ў 1932 г. заканадаўчыя акты далі пэўны станоўчы эфект. Калі ў 1929 г. на аднаго рабочага цэнзавай прамысловасці БССР прыпадала ў сярэднім 1,14, у 1932 г. — 4,41 дня прагулаў, то ў 1934 г. — 0,64 дня. Эфект гэты, аднак, не быў дастаткова працяглым.

У студзені 1939 г. былі праведзены масавыя праверкі цэнтральных і абласных савецкіх устаноў (судоў, наркаматаў, торгаў, трэстаў), фабрык і заводаў. Праверкі паказалі, што ўзровень дысцыпліны не быў высокім. Так, на фабрыцы "КІМ" (Віцебск) з 1 па 10 студзеня спазніліся на работу 139 чалавек, з 10 па 20 студзеня — 106. У Добрушы на фабрыцы "Герой працы" з 1 па 22 студзеня прагулы зрабілі 101 чалавек, спазненні — 106 і г.д.

Пастанова прадугледжвала ўвядзенне новых мер барацьбы за працоўную дысцыпліну: за спазненне на работу ў 20 хвілін супрацоўнік падлягаў звальненню. Для ліквідацыі цякучасці кадраў нормы страхавога забеспячэння па прычыне хваробы вызначаліся ў залежнасці ад стажу няспыннай работы на даным прадпрыемстве. З 1 студзеня 1939 г. уводзіліся працоўныя кніжкі, у якія заносіліся запісы аб стажы і працоўных заслугах працуючых.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г., прынятым па ініцыятыве ВЦСПС, устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень, 7-дзённы рабочы тыдзень, забаранялася скасаванне працоўных дагавораў па жаданні работнікаў, за прагулы і самавольны ўход з работы ўстанаўлівалася крымінальная адказнасць з пакараннем: за самавольны ўход — ад 2-х да 4-х месяцаў турэмнага зняволення, за прагул — да 6 месяцаў выпраўленчых работ па месцы работы з утрыманнем 25 працэнтаў заработнай платы. Указ ад 10 ліпеня 1940 г. прыраўняў да шкодніцтва выпуск недабраякаснай і некамплектнай прадукцыі, незахаванне абавязковых стандартаў. Указам ад 19 кастрычніка 1940 г. наркомам СССР давалася права пераводзіць кваліфікаваных рабочых і служаных, інжынерна-тэхнічных работнікаў з адных прадпрыемстваў на другія, незалежна ад іх тэрытарыяльнага знаходжання. Уводзілася крымінальная адказнасць для асоб, вінаватых у невыкананні загада аб абавязковым пераводзе.

Поўны адыход у канцы 20-х гадоў ад эканамічных прынцыпаў рэгулявання развіцця народнай гаспадаркі СССР, спробы ўвядзення якіх былі прыняты ў час НЭПа, запатрабаваў узмацнення мер прымусовага характару для ажыццяўлення працоўнага працэсу. "Свабодная праца людзей, якія свабодна сабраліся" ўсё больш станавілася паэтычнай марай.

Умацаванне таталітарнай сістэмы, рост эканамічнай магутнасці СССР базіраваліся на абмежаваннях добраахвотнасці працы, наданні ёй прымусовага характару.

Таццяна ПРОЦЬКА,
кандыдат філасофскіх навук,
старшы навуковы
супрацоўнік Інстытута
гісторыі Акадэміі навук
Беларусі.

“АЛЕ Ж ШЛЯХ ДА СВАБОДЫ СТАРОНКА ПРАЛОЖА!”

(ДА ПЕРААСЭНСАВАННЯ РОЛІ Ў МІНУЎШЧЫНЕ КАСТУСЯ ЕЗАВІТАВА)

17 лістапада 1993 г. споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Барысавіча Езавітава. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў імя гэтага віднага дзеяча нацыянальна-дэмакратычнага руху, гісторыка, публіцыста, настаўніка не было вядома жыхарам Беларусі. У празмерна ідэалагізаванай і сфальсіфікаванай айчыннай гістарыяграфіі яно было забароненым, як і многія іншыя. Даследчыкі не маглі пазнаёміцца з яго жыццём і дзейнасцю ва ўсіх аспектах, бо дакументы знаходзіліся ў спецфондах архіваў і “спецсховішчах”. У сучасны перыяд пераасэнсавання мінуўшчыны варта шматбакова прааналізаваць і месца ў ёй Кастуся Езавітава. Безумоўна, ацаніць яго адназначна нельга, бо праца гэтага таленавітага чалавека, патрыёта мела супярэчлівы і складаны характар. Асабліва цяжка зразумець яго ўчынкі ў апошнія гады жыцця. Яшчэ ёсць шмат “белых плям” у яго жыццяпісе, якія чакаюць грунтоўных і аб'ектыўных даследаванняў. Аднак апублікаваныя на сённяшні час матэрыялы дазваляюць ужо прызнаць яго пэўны ўклад у станаўленне дзяржаўнасці Беларусі, захаванне і развіццё нацыянальнай адукацыі.

Нарадзіўся Кастусь Езавітаў 5 лістапада 1893 г. (па старым стылі) у г.Дзвінску Віцебскай губерні (зараз — г.Даўгаўпілс, Латвія), дзе праходзіў афіцэрскую службу яго бацька. Карані сям'і былі на Полаччыне. Як адзначаў Кастусь Езавітаў у аўтабіяграфіі, напісанай 29 кастрычніка 1943 г. для “Беларускай газеты” (гл.: Полацак) Кліўленд, ЗША). 1992. №5(15). С. 16 — 23), толькі тры разы яму пашчасціла вырвацца з горада і правесці летнія канікулы на радзіме бацькоў. Атрыманыя ўражанні паспрыялі фарміраванню светапогляду хлапца. Гэтыя паездкі, па яго словах, мелі вялікае значэнне: “мацней злучылі з родным народам” і аказалі “моцны ўплыў на... нацыянальны настрой у далейшым жыцьці і дзейнасьці”.

У час вучобы ў Дзвінскім 6-класным гарадскім вучылішчы Кастусь Езавітаў паказаў добрую здольнасць да авалодання ведамі. Там ён прымаў актыўны ўдзел у вучнёўскіх гутарках, выданні рукапісных часопісаў на беларускай і рускай мовах. Праяўляў цікавасць да кніг. Найбольш яму падабаліся апісанні падарожжаў, гістарычныя раманы. У школьныя гады захапіўся ідэямі народнікаў, якія яшчэ карысталіся папулярнасцю ў асяроддзі навучэнскай і студэнцкай моладзі Расіі. Менавіта апошняе і прадвызначыла яго прафесійны выбар — стаць настаўнікам. Гэта выклікала сямейны канфлікт, бо бацька жадаў бачыць сына афіцэрам. Юнак праявіў свой рашучы характар і дабіўся свайго: восенню 1910 г. здаў экзамены на званне настаўніка пачатковай школы. Ужо з вясны 1911 г. ён працаваў у школах Дзвінскага павета. Дзякуючы самаадукацыі Кастусь Езавітаў здолеў паспяхова здаць у 1913 г. уступныя экзамены ў Віцебскі настаўніцкі інстытут, дзе адразу ж уключыўся ў студэнцкі рух.

Падзеі першай сусветнай вайны рэзка павярнулі жыццёвы шлях студэнта Езавітава, як і мільёнаў жыхароў Беларусі. Лінія ваенных дзеянняў захапіла сваім разбуральным характарам беларускія землі і прасоўвалася на ўсход. Імкненне хутчэй стаць у рады яе абаронцаў прымусіла яго датэрмінова скончыць інстытут і ў першай палове 1916 г. прайсці паскораны (4-месячны) курс Паўлаўскага ваеннага вучылішча ў Петраградзе. “...Я таму так сьпяшыў з заканчэньнем інстытута і паступленьнем у вайсковае вучылішча, — тлумачыў Кастусь Езавітаў свае дзеянні ў згаданай аўтабіяграфіі, — што лічыў гэта пытаньнем гонару: бацька быў на фронце, а тры малодшых браты вучыліся ў Полацкім кадэцкім корпусе”. З гэтага часу вайсковая служба стала часткай яго жыцця. У гэтай галіне дзейнасці ён праявіў незвычайныя здольнасці, што паспрыяла яго бліскучай афіцэрскай кар'еры. Аднак вернасць прафесіі настаўніка ён захаваў і ў будучым яшчэ шмат зрабіў для асветы беларусаў.

Праз некаторы час пасля сканчэння вучылішча Кастусь Езавітаў у званні малодшага афіцэра добраахвотна адправіўся ваяваць у складзе 151-га пяхотнага Пяцігорскага палка. Такі выбар быў зроблены не выпадкова: там было шмат салдат-беларусаў, і размяшчалася вайсковая адзінка на ўчастку фронту насупраць Дзвінска.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ажывіўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, у тым ліку і сярод вайскоўцаў. Як дэлегат ад салдат-беларусаў, Езавітаў прымаў удзел у з'ездзе ваеннаслужачых-беларусаў Паўночнага фронту ў Віцебску ў лістападзе 1917 г. Там ён быў уключаны ў склад Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (створана ў жніўні таго ж года), якая практычна занялася арганізацыяй беларускіх вайсковых фарміраванняў.

Заклапочанасць далейшым лёсам Беларусі (падрыхтоўка да заключэння сепаратнага міру паміж Савецкай Расіяй і Германіяй пагражала падзелам яе зямлі) прывяла Езавітава, як і многіх яго суайчыннікаў, на Першы Усебеларускі з'езд. Гэтая падзея, згодна няскончаных яго ўспамінаў (гл.: Беларуская мінуўшчына. 1993. №1. С. 25 — 29), адыграла “дужа вялікую ролю ў гісторыі змаганьня беларускага народу за стварэньне незалежнае дзяржавы”. Бальшавікі, якія непрыхільна ставіліся да ідэі беларускай дзяржаўнасці, 17 снежня 1917 г. разагналі кангрэс. Рух за стварэнне дзяржаўнасці ўцалеў. У склад выбранага ў падполлі Выканаўчага камітэта Рады з'езда ўвайшоў і Кастусь Езавітаў у якасці Народнага сакратара па ваенных справах. Неўзабаве ВЧК арыштавала яго і кінула ў турму. Толькі наступленне нямецкіх войск вызваліла яго адтуль. Пасля таго як бальшавікі пакінулі 19 лютага 1918 г. Мінск, улада перайшла да Выканаўчага камітэта. Камендантам горада быў прызначаны Езавітаў. Ва ўрадзе БНР, незалежнасць якой была абвешчана 25 сакавіка таго ж года, ён стаў міністрам вайсковых спраў. Аднак нежаданне акупацыйных улад парушаць абавязацельствы Брэсцкага міру і іх боязь узброіць мясцовае насельніцтва не далі магчымасці арганізаваць беларускае войска. Менавіта гэта прымусіла займацца найперш культурна-асветніцкай працай.

Намаганнямі К.Езавітава былі створаны курсы для настаўнікаў Міншчыны па беларусазнаўстве. Лекцыі чыталі У.Ігнатоўскі, Я.Варонка (па айчыннай гісторыі), А.Смоліч (геаграфіі), Я.Лёсік, М.Масоніюс, Т.Грыб (беларускай мове і літаратуры). Ліквідацыя ў Расіі эвакуіраваных з Беларусі ў час вайны школ і культурна-асветніцкіх устаноў патрабавала неадкладных захадаў з боку ўрада БНР па вяртанні іх назад. Так, 19 верасня 1918 г. быў вернуты з Яраслаўля Мінскі настаўніцкі інстытут. Яго ўладкаваннем таксама займаўся Кастусь Езавітаў.

Прымаў удзел ён і ў арганізацыі Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Бацькаўшчына”, статут якога быў зацверджаны 17 жніўня 1918 г. Мэтай таварыства было правядзенне ідэі нацыянальнага адраджэння ў масы беларускага народа і яго суседзяў. Пазней асабіста ім былі арганізаваны аддзелы “Бацькаўшчыны” ў Беластоку, Гародні, Коўна.

Пасля эвакуацыі нямецкіх войск з Беларусі ў канцы 1918 г. адсутнасць уласных узброеных сіл і непрызнанне з боку буйных дзяржаў свету не далі магчымасці абараніць першую спробу арганізацыі беларускай дзяржаўнасці. Разам з часткай Рады БНР Кастусь Езавітаў трапіў у Гародню, дзе камандаваў Беларускім пяхотным палком. Наступленне савецкіх войск з усходу і польскіх з захаду (асабліва з вясны 1919 г.) прымушала змагацца на два фронты. Аднак сілы былі няроўныя і полк, якім камандаваў Езавітаў, быў разгроены. Летам 1919 г. ён узначальваў канцылярыю Міністэрства беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы ў Коўна (Гродзеншчына ўвайшла ў склад гэтай краіны на правах аўтаноміі дзеля прадухілення сваёй акупацыі).

Заклапочаны ўціскам заходнебеларускага насельніцтва, ён выдаў там у 1919 г. кнігу “Белорусы и поляки. Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 годах” (выйшла на многіх мовах). Акрамя паказу гвалту над беларусамі, былі прыведзены паказчыкі даваеннай статыстыкі (Расіі і Германіі) адносна нацыянальнага складу насельніцтва, якія абвяргалі экспансіяністцкія прэтэнзіі польскай дзяржавы на Заходнюю Беларусь.

У 1919 — 1920 гг. палкоўнік Езавітаў з'яўляўся кіраўніком ваенна-дыпламатычных місій у Латвіі і Эстоніі. Займаўся там і грамадскай працай: у Рызе ім было створана аддзяленне таварыства “Бацькаўшчына”, якое працягвала лепшыя традыцыі папярэдніх аналагічных аб'яднанняў. Было наладжана друкаванне ілюстраванага часопіса “На чужыне”. Мэтай часопіса, як адзначалася ў яго першым нумары (і адначасова адзіным), было імкненне “выявіць усе беларускія сілы, працуючыя на чужыне, каб злучыць іх у моцны звязак і працягнуць руку помачы нашым змучаным братам на Бацькаўшчыне”. Усталёўваліся кантакты з беларускай эміграцыяй у ЗША. 17 мая 1920 г. урад БНР прысвоіў яму званне генерал-маёра “за выдатную працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі, выкананую ім за граніцаю”.

Рыжскі мірны дагавор ад 18 сакавіка 1921 г. не толькі замацаваў падзел тэрыторыі Беларусі, але і надоўга запаволіў працэс кансалідацыі нацыі. Згодна палажэнняў заключанага раней, 11 жніўня 1920 г., савецка-латвійская пагадненні, Кастусь Езавітаў вымушаны быў адмовіцца ад палітычнай дзейнасці і зноў заняцца выключна культурна-асветніцкай працай. Найперш тэрыторыяй дзейнасці стаў знаёмы з дзяцінства Дзвінскі край. Гэтыя землі (Дзвінскі, Люцынскі, Рэжыцкі паветы) на беларуска-латвійскім памежжы, дзе пераважала беларускае насельніцтва (па перапісу насельніцтва 1921 г. пражывала не менш як 70 тыс. беларусаў), былі ўключаны ў склад Латвіі. Менавіта наконт іх пісаў у вершы “На Даўгінаўскім гасцінцы” (1926 г.) Я.Купала: “Калісь мы ў Рыгу збожжа везлі, Цяпер зямлі завезлі часць...”. Аднак дзеля перасцярогі вымушаны быў дадаць: “Але ж куды мы, думка, улезлі? Гвяздзі, наклічыма напасьці!” (Купала Я. Жыве Беларусь: вершы, артыкулы. Мн., 1993. С. 412). У жыцці Езавітава перыяд 1920 — 1944 гг. быў насычаны клопатам аб арганізацыі нацыянальнай адукацыі для гэтага насельніцтва, навуковай і публіцыстычнай дзейнасцю.

Пасля прыняцця латвійскага грамадзянства ў 1921 г. ён адразу ж уключыўся ў работу. Гэтаму спрыяла дэмакратычнае заканадаўства краіны, якое дазваляла ўсім нацыянальным меншасцям адкрываць свае школы, аб'яднанні. Ужо 25 сакавіка 1921 г. (у гонар знамянальнай падзеі ў гісторыі Беларусі) у Дзвінску зноў было створана таварыства “Бацькаўшчына”, с[illegible] у адрозненне ад папярэдніх, павінна было разгр[illegible]ць культурна-асветную дзейнасць у межах адной краіны — Латвіі. Старшынёй яго стаў тутэйшы жыхар, настаўнік Я.Харлап, намеснікам — К.Езавітаў. Як пазней згадваў апошні ў адной са сваіх навуковых прац, “абмаскалены і апалячаны Дзьвінск варожа спаткаў” навіну аб узнікненні беларускай арганізацыі. Нягледзячы на цяжкасці, летам 1921 г. аддзелы Таварыства пачалі работу ў многіх месцах (Люцыне, Краслаўцы, Старой Слабадзе). Быў наладжаны кантакт з урадам Латвіі, якому была перададзена інфармацыя аб беларускай меншасці, яе патрэбах у галіне адукацыі, рэлігіі, гаспадарчага жыцця. Мясцовай адміністрацыі былі накіраваны заявы аб адкрыцці беларускіх школ.

Для вырашэння праблемы забеспячэння нацыянальных школ адпаведнымі кадрамі летам 1921 г. у Дзвінску былі арганізаваны 6-тыднёвыя настаўніцкія курсы, дзе з лекцыямі па беларусазнаўстве выступалі К.Езавітаў і І.Дварчанін, запрошаны сюды з Вільні. Па закліку К.Езавітава многія прадстаўнікі інтэлігенцыі з Заходняй Беларусі (Э.Будзька, А.Якубецкі, П.Мядзёлка, У.Пігулеўскі, С.Сіцько і іншыя) прыехалі настаўнічаць. Чыталі лекцыі тут і М.Гарэцкі, А.Луцкевіч. Восенню 1921 г. у Дзвінскім павеце былі адкрыты першыя 16 беларускіх пачатковых школ, настаўнікамі ў якіх былі выпускнікі згаданых курсаў.

Паступова наспела неабходнасць стварэння пры Міністэрстве асветы Латвіі асобнага аддзела, які ажыццяўляў бы кіраўніцтва беларускімі школамі. Эфектыўнасць наяўнасці такога органа для інтарэсаў нацыянальнай адукацыі пацвярджаў прыклад з заходнебеларускай рэчаіснасці: пры Дэпартаменце асветы Сярэдняй Літвы паспяхова дзейнічаў беларускі аддзел пад кіраўніцтвам Б.Тарашкевіча (1920 — 1922 гг.). Адсутнасць сваіх прадстаўнікоў у органах улады Латвіі прымушала хадайнічаць праз дэпутатаў іншых нацыянальных супольнасцяў. Першым з латышскіх дзеячаў адгукнуўся на гэта вядомы паэт, драматург, лідэр сацыял-дэмакратычнай партыі Я.Райніс. У лісце ад 18 жніўня 1921 г. на імя старшыні таварыства “Бацькаўшчына” ён запэўніваў: “Вы ў мяне заўсёды знойдзеце ў добрых справах добрага абаронцу”. У адказ Я.Харлап і К.Езавітаў выказалі яму падзяку і даручылі абаранаць інтарэсы беларусаў перад латвійскім урадам. 13 верасня таго ж года пры Міністэрстве асветы быў створаны Беларускі аддзел, кіраўніком якога быў зацверджаны С.Сахараў (дырэктар рускай гімназіі ў Лёцыне), а інспектарам — К.Езавітаў. Я.Райніс і надалей працягваў абараняць інтарэсы беларусаў у парламенце, садзейнічаў адкрыццю беларускіх гімназій у Дзвінску, калі быў міністрам асветы. Менавіта таму ў знак удзячнасці 17 верасня 1922 г. ён быў выбраны ганаровым сябрам таварыства.

Са снежня 1921 г. К.Езавітаў працаваў таксама на Беларускіх дзяржаўных ангажадовых настаўніцкіх курсах у Дзвінску. Там жа ў 1922 г. была адкрыта першая ў Латвіі беларуская гімназія, дырэктарам якой стаў Я.Красоўскі, пачалася праца па адкрыцці нацыянальнай сельскагаспадарчай школы.

Праца на ніве беларускай адукацыі патрабавала і пэўнай самаахвярнасці, напружання сіл. У лісце да А.Луцэвіча ў Вільню 3 чэрвеня 1922 г. К.Езавітаў пісаў: “... справу снабжэньня кніжкамі я ўзяў на свой кошт і, колькі дазволілі мне мае невялікія скарбы, правёў яе для некалькіх валасцей Дзьвінскага павету: вялікую дапамогу аказаў... Рак” (С.Рак-Міхайлоўскі, які ў той час з'яўляўся дырэктарам беларускай настаўніцкай семінарыі ў Барунах (Ашмяншчына) і выкладчыкам Віленскай беларускай гімназіі. — А.В.). Адзначаў таксама падтрымку з боку латвійскага ўрада: Беларускі аддзел атрымаў 100 тыс. руб., што дазволіла закупіць праз камерсанта Граніцкага некаторыя кнігі ў Беларускага Навуковага Таварыства (Вільня) (ЦБ АН Літвы, аддзел рукапісаў, ф.21, адз. зах. 293, ар.1).

У 1922 — 1924 гг. Кастусь Езавітаў быў дырэктарам другой беларускай гімназіі — у Люцыне (да жніўня 1923 г. мела статус прыватнай навучальнай установы). Наогул у гэты час у Латвіі дзейнічалі, акрамя 2 сярэдніх, каля 50 беларускіх пачатковых школ, настаўніцкія (2-гадовыя; з 1923 г. — у Рызе) і сельскагаспадарчыя курсы. Згадваючы гэты адрэзак свайго жыццёвага шляху, ён з задавальненнем адзначаў, што праца ў Люцынскай гімназіі дала “пачатак руху беларускай моладзі ў Латвіі”, які выліўся “ня толькі ў спартыўныя захапленьні, але і ў літаратурную працу і зьбіраньне фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, у выніку чаго зьявіўся вучнёўскі часапіс “Ластаўка” (усяго было выдадзена 9 нумароў. — А.В.) і збор запісаў беларускай народнай творчасьці, арганізацыя беларускіх скаўтаў і гайд”. Дух нацыянальнай свядомасці, маральнай чысціні, высокай культуры і імкнення да ведаў, самаўдасканалення панаваў у гэтых навучальных установах. Такая атмасфера з'яўлялася вынікам работы настаўнікаў і выхавацеляў. Многія з іх не былі па нацыянальнасці беларусамі, аднак служэнне беларускай асвеце прымалі як належнае. Невыпадкова, што, выхаваныя ў такім асяроддзі, многія выпускнікі Люцынскай і іншых нацыянальных гімназій плённа працавалі на карысць беларускай, латышскай, рускай, польскай, чэшскай, славацкай культур. Сярод іх — паэты А.Бартуль, П.Сакол (Масальскі), В.Казлоўская, М.Тадэрка, Э.Вайвадзіш, празаікі В.Вальтар, В.Вайлюцэвіч, мастакі П.Міраноўч, М.Калінін, кампазітар Ю.Александровіч-Фельдман, оперная спявачка Н.Мікалаева-Комісар, рэжысёр Я.Камаржынскі і іншыя.

Як і многія іншыя дзеячы беларускай эміграцыі, Кастусь Езавітаў выказваў занепакоенасць станам заходнебеларускага насельніцтва, якое падвяргалася ў межах польскай дзяржавы асіміляцыі. Аднак у першай палове 20-х гг. там шырокі размах набыў партызанскі рух. Болем за шматвяковыя пакуты свайго народа і настроем на намаганне дзеля яго далейшага існавання прасякнуты яго вершаваны допіс (яшчэ адна галіна самавыяўлення гэтай асобы) ад 28 мая 1923 г. пад псеўданімам “Кастусёнак”. Ён быў прысвечаны жыхарам Беласточчыны.

Ведаем мы, пральецца ў нас кроў, Ведаем —
многа сыноў Беларусі на Аўтар Незалежнасьці ўзлоха! Але ж будзем мы зноў меці волю дзядоў, але ж шлях да Свабоды
старонка пралажа! Ведаем мы!
Дык няхай-жа ахвяраў сьвятых
не шкадуе народ.
Хай на плачуць ні маткі, ні жонкі. Хай уся
моладзь і мужы ідуць
напярод.
Хай на бойку жагнаюць іх дзетак
ручонкі. Бяз крыві і ахвяр ніхто
долі ня ўзяў, ніхто праўды нідзе не дабіўся, і
калі наш Народ меч для
помсты падняў, — Бог дарус! —
бо вякі ён цярпеў,
і прасіў і маліўся!

(ЦБ АН Літвы, аддзел рукапісаў, ф. 21, адз. зах. 199, ар. 1) (Верш падаецца без змяненняў у аўтарскім арыгінале)

Прыведзеныя радкі сведчаць не толькі аб патрыятычных пачуццях аўтара, але і аб яго рашучым і валявым характары.

Поспехі беларускай асветы ў Латвіі паступова выклікалі непрыхільныя і нават варожыя адносіны латышскіх шавіністычных сіл, а таксама часткі рускіх і польскіх грамадскіх колаў у гэтай краіне. Менавіта гэта і прывяло да таго, што ў 1924 г. былі арыштаваны латвійскімі ўладамі 8 настаўнікаў беларускіх школ: К.Езавітаў, У.Корці, У.Пігулеўскі, Я.Краскоўскі, А.Якубецкі, П.Мядзёлка, П.Жэрдзі, М.Іваноў. Іх абвінавачвалі ў тым, што яны “прымалі актыўны ўдзел у злачынным таварыстве Латгалгі, якое ставіла сабе за мэту адарваць ад Латвійскай дзяржавы тэрыторыю Дзвінскага, Рэжыцкага, Люцынскага і часткова Ілукштанскага паветаў і далучыць іх да Беларускай дзяржавы...”. Бараніць іх на так званым “беларускім працэсе” згадзіліся найлепшыя адвакаты краіны. Апошняя акалічнасць разам з неабгрунтаванасцю і надуманасцю абвінавачанняў вырашыла выхад яго: 4 красавіка 1925 г. усе яны былі апраўданы. Аднак судовы працэс пашкодзіў беларускім школам. Некаторыя настаўнікі без латвійскага грамадзянства (П.Мядзёлка, Я.Краскоўскі) вымушаны былі пакінуць краіну. К.Езавітаў быў звольнены з Люцынскай гімназіі (адразу ж пасля гэтага ў тым жа 1925 г. яе далучылі да Дзвінскай) і пераехаў у Рыгу. На пэўны час беларускі рух быў паралізаваны. Найперш прыйшло ў заняпад таварыства “Бацькаўшчына”, якое адыграла значную ролю ў абуджэнні самасвядомасці тутэйшага беларускага насельніцтва.

У Рызе Кастусь Езавітаў працягваў займацца педагагічнай дзейнасцю. У гэты час у горадзе дзейнічалі таварыствы “Рунь” і “Беларуская хата”, беларуская гімназія, 4 беларускія пачатковыя школы, адну з якіх узначальваў Езавітаў, Беларуская дзяржаўныя настаўніцкія курсы. Усю работу каардынавала Таварыства беларускіх настаўнікаў, статут якога быў зацверджаны намаганнямі К.Езавітава ў верасні 1925 г. Непасрэдна яму даводзілася рэдагаваць часопіс “Беларуская школа ў Латвіі” (1926 — 1934 гг.). Набалелым пытаннем стала забеспячэнне школ падручнікамі на беларускай мове. Спадзявацца на атрыманне іх з Вільні, дзе польскімі ўладамі беларускае кнігадрукаванне было пастаўлена ў крытычнае становішча, ужо нельга было. У 1926 г. у Рызе выйшла пад яго рэдакцыяй кніга “Беларуская школа. Першая пасьля лемантара кніга для чытаньня”. Планавалася выдаць адпаведныя чытанкі для 2 — 6 класаў пачатковай школы і падрыхтоўчага класа гімназіі. Рэдагаваў К.Езавітаў і падручнік Я.Лёсіка “Наша крыніца. Чытаньне для беларускіх школ у Латвіі” (1917 г.). Змест выдання быў дапоўнены звесткамі пра Латвію, яе карэннае насельніцтва, яго культуру, беларускую меншасць у гэтай краіне. Быў змешчаны і адрэдагаваны пераклад драмы Я.Райніса “Агонь і ноч”. Не без удзелу К.Езавітава складаліся навучальныя праграмы для беларускіх пачатковых школ (па гісторыі Латвіі, краязнаўстве і іншых прадметах). Дарэчы, шмат намаганняў аддаваў ён арганізацыі і кіраванню “Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства”.

У 1929 г. “Беларускае выдавецкае таварыства ў Латвіі” надрукавала яго кнігу “Беларусь у мінулым і сучасным (Канспэкт пазашкольнаму працаўніку для лекцыяў з чароўным ліхтаром)”. У гэтым дапаможніку аўтар прапаноўваў выкарыстоўваць для правядзення культурна-асветніцкай работы дыяпазітывы, якія сам падрыхтаваў яшчэ ў 1922 г., па наступных тэмах: “Паходжанне беларускага народу”, “Пачаткі беларускай дзяржаўнасці”, “Нацыянальна-адраджэнскі рух”, “Сучаснае становішча беларускага народу”. Цікавасць уяўляюць тлумачэнні па апошняй тэме. “Савецкая Беларуская Рэспубліка не змагла зьдзейсьніць усіх нацыянальных лятуценьняў беларускага народу. Яна шмат зрабіла для беларускае культуры (маюцца на ўвазе поспехі працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі, выкананую ім за граніцаю”.

палітыкі беларусізацыі ў 20-я гады. — А.В.)... аднак Савецкая Беларусь ня здолела зрабіць яшчэ самага галоўнага, ня здолела сабраць у адно цэлае ўсіх беларускіх зямель, якія да гэткага часу астаюцца падзеленымі...”. Менавіта тэрытарыяльнае размежаванне перашкаджала нармальнаму культурна-нацыянальнаму развіццю беларусаў. Толькі ў межах Латвіі, за выключэннем БССР, былі для гэтага найбольш спрыяльныя ўмовы. Невыпадкова, што гэта выклікала зайздрасць у заходнебеларускіх дзеячаў. “З праўдзівай завісьцю прыходзіцца ўглядацца нам, “заходнікам”, на тое, што мае, да прыкладу, маленечкая жменя беларусаў... у Латвіі (Беларускі звон. 1931. 27 мая). Аднак складанасць згаданай праблемы не перашкодзіла Кастусю Езавітаву зрабіць аптымістычную выснову, што “Беларусь... выйдзе з усіх гэтых гістарычных перадраг культурна і нацыянальна ўзрошшаю, цэлаю, значна памацнеўшаю і аб'яднанаю ў адну нацыянальна-дзяржаўную адзінку”.

У час сваёй паездкі ў Латвію ў 1932 г. А.Луцкевіч змог пазнаёміцца з тым, што “прадстаўляе вынік 10-гадовае працы тамтэйшага беларускага грамадзянства і галоўных яго правадыроў — К.Езавітава і У.Пігулеўскага, ведзеная ў нармальных варунках” (Беларускі звон. 1932. 4 чэрвеня). Гэта пацвердзіў у лісце да яго ў Вільню і сам К.Езавітаў (22 чэрвеня 1932 г.). “... Думаю, што... распачатае мною яшчэ ў 1921 годзе, дало тутака свае вынікі. ...Маё самае шчырае жаданьне захаваць усё, што мы маемо зара (хоць многае ўжо згублена), па магчымасьці ўмацаваць яшчэ больш і знайсьці новыя галіны для пашырэньня нашага руху тутака...”. У лісце ён падкрэсліваў, што яму не ўласцівы аўтарытарныя метады работы. “Я не ганюся за тым, каб створаныя з маёй ініцыятывы таварыства, школа... заўсёды знаходзіліся пад маім кіраваньнем... Хай прыходзяць іншыя і працуюць...” (ЦБ АН Літвы, аддзел рукапісаў, ф.21, адз. зах. 279, ар. 16 — 17).

У 20-х гг. беларускі рух у Латвіі атрымліваў пэўную інфармацыйна-метадычную, фінансавую дапамогу і з БССР. Гэта з'яўлялася лагічным працягам той праграсіўнай нацыянальнай палітыкі, якая ажыццяўлялася ў рэспубліцы. Аднак паступова такая падтрымка, без якой не маглі нармальна функцыянаваць беларускія арганізацыі за мяжой, ператварылася ў інструмент утаймоўвання “непаслухмяных”, пашырэння ўплыву камуністычнай ідэалогіі. Так, на закрытым пасяджэнні сакратарыята ЦК КП(б)Б 31 ліпеня 1925 г. было вырашана: “Лічыць неабходным падтрымаць беларускую газету ў Латвіі ”Голас Беларуса” (яе рэдагаваў у 1925 — 1929 гг. К.Езавітаў. — А.В.) пры ўмове забеспячэння ў яе рэдакцыі камуністычнага ўплыву... Асігнаваць на першы час 300 рублёў” (НА РБ, ф.4, воп.3, спр. 6, ар. 253). У каштарысе на фінансаванне беларускага руху за мяжой у 1926 — 1927 гг. самастойная палітычная лінія К.Езавітава падвергнута рэзкай крытыцы: “... Наша работа, якая праводзілася праз Езавітава, не застрахавана ад ”сюрпрызаў”, нявыгадных для нас... Слабы водгук на падзеі ў Польшчы. Палітычны авантурызм і шкурніцтва Езавітава...”. Адразу ж прыняты адпаведныя захады: “Для Латвіі плануецца па 1 тыс. руб. у месяц (750 руб. на прэсу і 250 руб. на падтрымку... арганізацый)... Сціплая сума 250 руб. у месяц ... дасць магчымасць беларускім дзеячам, якія падзяляюць платформу Мінска, супрацьдзейнічаць псеўданацыянальнай рабоце ўрадавых беларусаў...” (НА РБ, ф.4, воп. 21, спр. 112, ар. 98,2).

Згаданыя меры былі праявай той афіцыйнай палітыкі БССР адносна беларускай эміграцыі, якая была сфармулявана ў тэзісах ЦК КП (б)Б “Белорусское движение за кордоном” ад 16 кастрычніка 1925 г. і ажыццяўлялася на працягу сярэдзіны 1920 — 1980 гг. Прадугледжвалася “працягваць работу на разлажэнню і драбленню беларускай эміграцыі, ні ў якім разе не дапусціць стварэння якіх бы то ні было беларускіх аб'яднанняў”, таму што гэта “затармозіць развіццё беларускага руху савецкай арыентацыі” (Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии. Т.1. Сб. док. Мн., 1990. С.195, 197). Менавіта гэта з'явілася адной з прычын таго, што многія дзеячы беларускай эміграцыі занялі непрымірымыя антыкамуністычныя пазіцыі і ўскладалі надзею на знешнія сілы ў справе аднаўлення дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

Са згортваннем з канца 20-х гг. палітыкі беларусізацыі ў БССР і пачаткам барацьбы з так званым “нацыянал-дэмакратызмам” ідэалагічнаму цкаванню падвергліся і беларускія дзеячы за мяжою. Жорсткія і абсурдныя абвінавачанні супраць К.Езавітава былі прыведзены ў кнізе “Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі” (аўтар — І.Доўгі), якая выйшла ў свет у 1993 г. у Мінску. І гэта ў той час, калі за актыўны ўдзел у палітычным і культурна-асветніцкім жыцці беларусаў у Латвіі той неаднаразова арыштоўваўся мясцовымі ўладамі (у 1930, 1934, 1935 гг.). Стварэнне такой нездаровай маральнай атмасферы яшчэ больш абвастрала праблему далейшага існавання там беларускіх школ. У гэты перыяд, калі да ўлады прыйшоў дыктатар К.Ульманіс, іх закрывалі. Аднак да фізічнай ліквідацыі К.Езавітава не дайшло. У згаданай ужо аўтабіяграфіі ён адзначыў, што “бальшавікі ...не чапалі”, бо імя яго, пакутніка “латышскага кулацкага ўраду”, было патрэбна для правядзення ідэалагічнай прапаганды. З прыведзенага вышэй вынікае, што малаверагодным з'яўляецца яго супрацоўніцтва з савецкай разведкай, хоць і падмацаванае публікацыяй адпаведных архіўных дакументаў са “спецсховішчаў” (гл.: Хацкевіч А. Генерал Езавітаў: здраднік ці агент КДБ?) (Звязда. 1992. 19 жніўня). Безумоўна, пакуль нельга яшчэ адназначна гэта сцвярджаць. Больш таго, складанасць умоў працы магла гэтаму садзейнічаць.

І зноў справай беларускіх школ Кастусь Езавітаў займаўся ў час акупацыі немцамі Латвіі ў 40-х гг. Тады там працавалі 2 беларускія гімназіі і 4 нацыянальныя пачатковыя школы.

Акрамя педагагічнай дзейнасці, К.Езавітаў шмат часу прысвячаў навуковым даследаванням. У міжваенны перыяд яго навуковыя артыкулы пад псеўданімам “М.Зінук” друкаваліся ў выданнях Германіі. Разумеючы неабходнасць захавання гістарычнай спадчыны для будучых даследчыкаў, ён з задавальненнем успрыняў навіну аб арганізацыі (у час вайны) у Празе Беларускага загранічнага архіва і нават прапанаваў праграму пошуку, захавання дакументаў. Яго асабісты архіў быў даволі цікавы і багаты (частка была вывезена ім у канцы вайны ў Заходнюю Еўропу, адкуль разышлася яна па ўсім свеце, частка загінула ці апынулася ў спецфондах архіваў). Вялікая бібліятэка налічвала шмат рэдкіх і каштоўных рукапісаў. У той жа час ім вялася праца па напісанні ўспамінаў пра падзеі 1917 — 1918 гг. і кнігі “Беларускі бібліяграфічны слоўнік”.

З сярэдзіны 1944 г. Кастусь Езавітаў быў уцягнуты ў працэс арганізацыі беларускіх вайсковых адзінак, якія выступілі на баку нямецкіх войск. Як і многія іншыя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі, ён ступіў на шлях калабарацыянізму з надзеяй такім шляхам адрадзіць незалежнасць Беларусі.

У красавіку 1945 г. быў арыштаваны ў Германіі савецкай контрразведкай і змешчаны ў турму. Памёр у час следства 23 мая 1946 г. ад сухотаў.

Жыццёвы шлях гэтага беларускага дзеяча быў цярністы і супярэчлівы. Такой была і эпоха, калі ён тварыў. Аднак нельга па-ранейшаму ацэньваць гістарычных асоб толькі станоўча ці, наадварот. Калі мы хочам ведаць аб'ектыўную гісторыю, то павінны пераадолець заганнасць такога стэрэатыпнага мыслення. Менавіта такі падыход патрэбен і пры знаёмстве з дзейнасцю Кастуся Езавітава.

Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ,
выкладчык Брэсцкага педагагічнага інстытута.

працаваць на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі, выкананую ім за граніцаю”.

ПРАПАНУЕ ТЭЛЕЭКРАН

ПАНЯДЗЕЛАК, 6 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.55 Тэлебачанне — школе. Выпускныя экзамены. Беларуская і руская мовы. 9.05 Пад купалам Сусвету. 9.15 Пяць хвілін на жарты. 9.20 "Чарапашкі ніндзя". Мультфільм. 9.50 Прэм'ера спектакля Беларускага тэлебачання. Э.Радзінскі "Забіць мужчыну". Частка 3-я. 10.35 Дзелавы веснік. 13.30 Навіны. 13.40 АВС-клуб. Англійскую мову вучым самі. 16.25 Еўрапейскі калейдаскоп. 16.55 Да 50-годдзя вызвалення Беларусі. "Жывыя і мёртвыя". Мастацкі фільм. 1-я серыя. 17.30 Навіны. 17.40 "Ой, бяседа, бяседачка... Спявае ансамбль народнай музыкі "Бяседа". 18.15 Абласныя навіны (Брэст). 18.25 Навіны Бі-бі-сі. 18.55 "Радок чароўны... 19.00 Трыбуна кандыдатаў у прэзідэнты. 20.40 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.35 Пяць хвілін на жарты. 21.40 Прэм'ера спектакля Беларускага тэлебачання. Э.Радзінскі "Забіць мужчыну". Частка 4-я. 22.30 Студыя "Тэлесябрына". Імгненне шчырасці. 22.35 Спартыўны тэлекур'ер. 22.55 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. 23.00 Падзенне зямлі Полацкай. Рэпартаж аб святкаванні Дня Святой Еўфрасінні. 0.30 Надвор'е. 0.40 Пад купалам Сусвету.

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.15 Раніцішняя размінка. 5.30 Раніца. 7.45 Файнэншл таймс. 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00 Навіны. 8.20